Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 36 (28652)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Сямейныя адносіны і медыятар

СТАР. 4



Рэцэпты для пасляховай школы

СТАР. 7



Добрай ночы, спіце на здароўе

СТАР. 11

# ДЗВЕ ГАРАДЖАНКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Метадыст Гарадоцкага Дома рамёстваў Анжаліка ФЁДАРАВА дэманструе мясцовы традыцыйны жаночы святочны строй, які быў адроджаны групай майстроў гэтай установы.**

**Гарадоцкі строй атрымаў абласны Гран-пры ў галіне культуры і захавання традыцый.**

**Здымак зроблены на беразе невялікай рэчкі Гаражанкі, якая працякае праз заснежаны Гарадок.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча:**

*«Экспарт сельгаспрадукцыі прадпрыемствамі розных формаў уласнасці ў 2017 годзе склаў каля $5 млрд. Прадпрыемствы Мінсельгасхарча пастаўлялі прадукцыю ў 70 краін свету — гэта на восем краін больш, чым у 2016 годзе. Лідарам па экспарце прадукцыі прадпрыемстваў Мінсельгасхарча з'яўляецца Расія — $2,1 млрд. Мы імкнёмся захаваць гэты рынак, але пры гэтым знізіць залежнасць ад яго і дыверсіфікаваць экспарт. І гэта нам паступова ўдаецца. Другое месца па экспарце сельгаспрадукцыі займае Казахстан — $72 млн. Трэцяе — Украіна ($38 млн). Пастаўкі прадпрыемстваў Мінсельгасхарча ў Турцыю ў 2017 годзе выраслі ў 107 разоў і склалі $10,8 млн. Беларусь таксама імкнецца да пашырэння паставак сельгаспрадукцыі ў ЕС.*
*У 2017 годзе экспарт у Польшчу склаў $10,6 млн, на другім месцы сярод краін ЕС — Літва ($6,4 млн)».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | -1° |
| Віцебск | - 6° |
| Гомель | - 4° |
| Гродна | -1° |
| Магілёў | - 5° |
| Мінск | - 3° |

ISSN 1990 - 763X

■ Размова па сутнасці

# «НЯМА НА ЗЯМЛІ ТАГО ШЧАСЦЯ І ГОРА, ЯКОГА Б ТЫ НАМ ПЕРАДАЦЬ НЕ МАГЛА...»

## Ужыванне беларускай мовы ў розных сферах: культура і пісьменнасць

**Арганізоўваючы ў рэдакцыі круглы стол з такой назвай, спецыяльна прымяркоўвалі яго па часе так, каб апублікаваць менавіта сёння, у Дзень роднай мовы. Здавалася б, усё лагічна і сімвалічна, і нават радасна было, што так яно атрымаецца. Але адзін з удзельнікаў нашай размовы, шаноўны акадэмік, на самым пачатку тут жа збіў увесь імпэт і ўзнёсласць: «Чаму мы гаворым аб праблемах беларускай мовы толькі адзін тыдзень у годзе — у канцы лютага? Чаму гэта тэма не гучыць у нас пастаянна? Ці не лагічней было б у Дзень роднай мовы абмяркоўваць праблемы моў нацыянальных меншасцяў, якія жывуць у нашай краіне, а не той, якая носіць статус дзяржаўнай?..» Што ж, паважаны суразмоўнік несумненна мае рацыю. Але ж каб выйшла так, як бачыцца ў ідэале, трэба з нечага пачынаць. Хоць бы і ў Дзень роднай мовы. Тым больш што гутарка атрымалася ў нас не пра тое, што ўжо многім набіла аскоміну, — як важна ў Беларусі па-беларуску размаўляць, а пра тое, як з мовай абыходзяцца ўласна тыя, хто ёй карыстаецца або спрабуе гэта рабіць. А такіх людзей у нашай краіне становіцца ўсё больш. І дзе, як не на старонках беларускамоўнай газеты, паразважаць пра тое, наколькі ашчадна, паважліва, пісьменна мы ўжываем мову, як яна пад уплывам часу змяняецца, добрыя гэтыя змены ці не вельмі.**



СТАР. 8-9

■ Балючая тэма

# СЛЯЗІНКА ДЗІЦЯЦІ

«У зоне рызыкі тыя, хто абдзелены ўвагай бацькоў. Дастатак сям'і значэння не мае», — гавораць спецыялісты пра ахвяр педафілаў

**За апошнія пяць гадоў колькасць выяўленых супрацьпраўных дзеянняў, звязаных з педафіліяй, у Беларусі вырасла ў 15 разоў. Пры гэтымапытанне на сайце МУС паказала, што некаторыя да гэтага часу лічаць, што падымаць гэтую тэму не варта, маўляў, навошта лішні раз абвастраць становішча. На наш погляд, казаць пра гэта неабходна, бо праінфармаваны — значыць, як мінімум, папярэджаны.**

### «Гэта наша маленькая таямніца...»

На самай справе прыведзеная вышэй статыстыка не гаворыць аб рэзкім павелічэнні колькасці псіхічных адхіленняў сярод насельніцтва нашай краіны. Ключавое слова ў гэтым сцвярджэнні — выяўленых. Раней падставай для правядзення праверкі і распачынання крымінальнай справы з'яўляліся заявы ад бацькоў і законных прадстаўнікоў непаўналетняга. Аднак такіх заяў было мала, паколькі многія не хацелі па шэрагу прычын афішаваць сітуацыю. З 2013 года, згодна з загадам МУС, выяўленне злачынстваў, што закранаюць палавую недатыкальнасць непаўналетніх, з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў для падраздзяленняў, якія спецыялізуюцца на гэтай праблематыцы. Так, толькі ў мінулым годзе было ўстаноўлена 606 пацярпелых і больш як 200 падазраваных.

СТАР. 4

# МЭТА — АДНАВІЦЬ УЗРОВЕНЬ ТАВАРААБАРОТУ

**На гэтым тыдні з візітам у нашай краіне знаходзіцца міністр замежных спраў Алжыра Абдэлькадэр Месахель. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са спадаром Месахелем і абмеркаваў, якія сферы могуць дазволіць вывесці эканамічныя адносіны з гэтай паўночнаафрыканскай краінай на новы ўзровень.**

«Той узровень адносін, які ў нас існуе з вашай краінай, дружалюбнай нам краінай, нельга прызнаць здавальняючым. Тым больш на фоне зніжэння гандлёва-эканамічных сувязяў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Летась аб'ём двухбаковага тавараабароту склаў $1,96 млн. Асноўныя пазіцыі беларускага экспарту — калійныя ўгнаенні і канцылярскія вырабы, з Алжыра імпартуюцца лекавыя сродкі і садавіна. У значнай ступені такі ўзровень двухбаковых эканамічных адносін абумоўлены тым, што ў гандлі з Еўрапейскім саюзам Алжыр мае льготныя ўмовы ў выглядзе нулявой тарыфнай стаўкі. А аб'ём беларускага экспарту з 2015 года значна ўпаў: алжырскі ўрад прыняў меры па абмежаванні імпарту з-за эканамічнага спаду, выкліканага зніжэннем сусветных цэн на нафту.

Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што візіт міністра можа даць сур'ёзны імпульс для развіцця адносін і аднаўлення тавараабароту, які калісьці складаў больш за $200 млн.

Беларусь можа прапанаваць гэтай паўночнаафрыканскай краіне шэраг тавараў, у якіх яна зацікаўлена. У тым ліку малочныя прадукты. Прэзідэнт адзначыў, што «з пункта гледжання лагістыкі, Алжыр выглядае вельмі прывабна». Таму кіраўнік дзяржавы запэўніў суразмоўніка, што, калі з алжырскага боку будзе садзейнічанне, мы гатовы працаваць і ў сферы прамысловасці, і ў АПК. «І не проста пастаўляць вам прадукцыю сельскай гаспадаркі, тую ж малочную прадукцыю, але і стварыць адпаведныя магутнасці разам з вамі на тэрыторыі Алжыра», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, перспектыўным можа быць ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Што датычыцца машынабудавання, то Алжыр займае сярод краін Афрыкі першае месца па плошчы, таму работа для рознай тэхнікі і будаўнічых кампаній там знойдзецца. «Словам, мы адкрыты і гатовыя да любога супрацоўніцтва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Абдэлькадэр Месахель пагадзіўся, што ўзровень эканамічных адносін паміж краінамі нашмат ніжэйшы за тыя, якія мы маглі б мець. І адзначыў, што мэта яго візіту — наладзіць сёння эканамічнае ўзаемадзеянне і зрабіць яго больш інтэнсіўным.

***

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Абдэлькадэр Месахель накіраваўся ў Міністэрства замежных спраў, дзе прайшла сустрэча з кіраўніком беларускага знешнепалітычнага ведамства Уладзімірам Макеем. Бакі падпісалі першыя ў гісторыі двухбаковых адносін міжурадавыя пагадненні — аб стварэнні сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве і аб адмене віз для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых (афіцыйных) пашпартоў.

Уладзімір Макей адзначыў, што перагаворы былі вельмі канкрэтныя і прадметныя. У выніку бакі дамовіліся, што першае пасяджэнне створанай камісіі пройдзе да канца гэтага года ў Алжыры, а таксама запланавалі зрабіць «дарожную карту» гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ — З УВАГАЙ ДА БІЗНЕСУ

**У сакавіку-красавіку гэтага года Міжнародная фінансавая карпарацыя (МФК), што ўваходзіць у Групу Сусветнага банка, плануе пачаць рэалізацыю новай праграмы кансультацыйнай дапамогі нашай краіне. Пра гэта паведаміла кіраўнік прадстаўніцтва карпарацыі ў Беларусі Вольга Шчарбіна.**

«Сёння мы разглядаем падрыхтоўку новай праграмы кансультацыйнай дапамогі Беларусі. Яна будзе нацэлена на ўдасканаленне дзелавога асяроддзя, інвестыцыйнага клімату, і мы разглядаем некалькі кампанентаў, якія маглі б увайсці ў такую праграму. Мяркуецца, што яна будзе разлічана на чатыры гады», — адзначыла кіраўнік прадстаўніцтва. Па яе словах, больш актыўна рэалізоўваць праграму пачнуць ужо ў сакавіку-красавіку 2018-га.

Адзін з кампанентаў новай праграмы — гэта ўдасканаленне ўмоў вядзення бізнесу на тэрыторыі Беларусі з пункта гледжання зніжэння адміністрацыйных бар'ераў. Другі — гэта развіццё канкурэнцыі і садзейнічанне антыманапалістычнай дзейнасці, каб у кампаній былі роўныя магчымасці весці свой бізнес у Беларусі незалежна ад формы ўласнасці.

Вольга Шчарбіна звярнула ўвагу, што сустрэча з беларускімі дэпутатамі з'яўляецца вельмі важнай. «Мы бачым, наколькі павысілася актыўнасць дэпутацкага корпуса пры падрыхтоўцы новых заканадаўчых актаў, і хацелі б больш цесна з імі супрацоўнічаць», — адзначыла яна.

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслава ШЧЭПАВА, дэпутаты хочуць абмеркаваць з прадстаўнікамі МФК тэмы, звязаныя з нарматворчым працэсам, а таксама паляпшэннем інвестыцыйнага клімату. Тым больш што плануецца правядзенне парламенцкіх слуханняў акурат па другім пункце. «І мы з задавальненнем запросім прадстаўніцтва МФК для іх удзелу», — падкрэсліў парламентарый.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## CNN: ЗША НАРОШЧВАЮЦЬ ВАЕННУЮ ПРЫСУТНАСЦЬ У ЧОРНЫМ МОРЫ З МЭТАЙ ПРОЦІДЗЕЯННЯ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ



Злучаныя Штаты нарошчваюць сваю ваенную прысутнасць у Чорным моры, лічачы гэта неабходным адказам на ўзрослую актыўнасць Расіі ў рэгіёне. Пра гэта паведаміў тэлеканал CNN са спасылкай на ваенныя крыніцы.

У суботу эсмінец ВМС ЗША Carney ўвайшоў у Чорнае мора, далучыўшыся да яшчэ аднаго амерыканскага баявога карабля, які знаходзіцца там. Як заявіў камандуючы 6-м флотам ВМС ЗША віцэ-адмірал Крыстафер Грэдзі, рашэнне «накіраваць адразу два караблі ў Чорнае мора было прынятае загадзя, а не ў якасці рэагавання на штосьці-небудзь».

Адна з крыніц тэлеканала падкрэсліла, што з дапамогай такога кроку Вашынгтон, у прыватнасці, спрабуе дабіцца таго, каб ваенная прысутнасць ЗША ў Чорным моры стала новай нормай для Расіі, жадаючы такім чынам «паменшыць адчувальнасць» Масквы ў адносінах да актыўнасці амерыканскіх узброеных сіл у рэгіёне. CNN сцвярджае, што Расія востра рэагуе на прысутнасць узброеных сіл ЗША ў гэтым раёне, бо асцерагаецца, што гэта можа падарваць яе ўласныя ваенныя магчымасці. «Вы накіроўваеце караблі ў Чорнае мора, і яны [рускія] адчуваюць, што ім пагражаюць яшчэ больш», — цытуе тэлеканал прадстаўніка ваенных колаў ЗША.

Па словах крыніц, гэта, у прыватнасці, тлумачыць усё больш частыя выпадкі «небяспечных перахопаў» расійскімі знішчальнікамі амерыканскіх разведсамалётаў над нейтральнымі водамі Чорнага мора.

## СТУДЭНТЫ ЗЛАДЗІЛІ ЛЯЖАЧЫ ПРАТЭСТ КАЛЯ БЕЛАГА ДОМА



Навучэнцы патрабуюць зрабіць больш жорсткім кантроль за абаротам зброі ў краіне. У Вашынгтоне акцыя прайшла проста каля сцен Белага дома: сямнаццаць навучэнцаў (менавіта столькі было расстраляна на мінулым тыдні ў Парклендзе) ляглі на асфальт, а іх таварышы трымалі плакаты з пытаннем: «Мы — наступныя ахвяры?».

Рэакцыі пакуль не паступіла, прэзідэнта ЗША ў рэзідэнцыі не было. Між тым стала вядома, што за апошні год Нікалас Круз, які абвінавачваецца ў забойстве, набыў дзесяць адзінак зброі. Менавіта таму маніфестанты вінавацяць у трагедыі ФБР, якое не адрэагавала на падобныя дзеянні.

## ЗША ЗАКЛІКАЛІ УКРАІНУ «ВЫКАНАЦЬ АБЯЦАННІ МАЙДАНА»

Дзяржаўдэпартамент ЗША звярнуўся да ўлад Украіны ў гадавіну Майдана, каб заклікаць да далейшага правядзення рэформаў, перадае РІА «Навіны».

«Украіна распачала ў апошнія гады шмат важных крокаў, але трэба яшчэ прарабіць нямала працы, каб выканаць абяцанні Майдана і рэалізаваць патэнцыял Украіны. Злучаныя Штаты заклікаюць лідараў Украіны падвоіць намаганні, каб рэалізаваць глыбокія, усеабдымныя і актуальныя рэформы, неабходныя для будаўніцтва стабільнай, дэмакратычнай, квітнеючай і свабоднай краіны», — гаворыцца ў заяве афіцыйнага прадстаўніка Дзяржэпартамента Хізэр Наўэрт.

Яна таксама падкрэсліла, што амерыканскае кіраўніцтва ганарыцца падтрымкай «еўрапейскага выбару Украіны».

■ З нагоды

# КНІГА ЧАКАЕ

### Да правядзення XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу падрыхтоўка амаль скончана

— Практычна, да яе мы ўжо падрыхтаваныя на 95 працэнтаў, засталося дашліфаваць некаторыя грані. Я спадзяюся, што сёння-заўтра на сайце міністэрства будзе апублікавана праграма мерапрыемстваў, — расказала падчас прэс-канферэнцыі **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Алена ПАЎЛАВА.**

Выстаўка-кірмаш будзе працаваць з 28 лютага па 4 сакавіка ў адміністрацыйным комплексе на праспекце Пераможцаў, 14. На 20 лютага заяўкі на ўдзел прыйшлі ад 32 краін, сваю прысутнасць пацвердзілі 34 пісьменнікі з 21 краіны.

— Гэта надзвычай добры для нас паказчык, бо за апошнія чатыры гады не магу ўспомніць такой колькасці зацікаўленых гасцей. З улікам прадстаўнікоў ад пасольстваў, можна разлічваць, што на міжнародным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час» будзе каля 50 удзельнікаў, — адзначыла Алена Паўлава.

З замежных краін вельмі актыўнымі паказалі сябе пасольствы Расіі, Італіі, Вялікабрытаніі, Польшчы, Германіі. І хоць плошча пляцоўкі, дзе будзе праходзіць выстаўка, не зменіцца, насычанасць цікавымі сустрэчамі абяцае быць на вышыні. Штодзень арганізатары абяцаюць каля 60 мерапрыемстваў, так што знайсці нешта на свой густ зможа кожны наведвальнік. Тым больш, што ўваход на выстаўку, як і ў мінулыя гады, поўнасцю адкрыты і бясплатны.

Асаблівы госць сёлетняй міжнароднай выстаўкі — Рэспубліка Сербія, акрамя прадстаўнікоў улады гэтай краіны, Беларусь наведаюць чацвёра пісьменнікаў-сербаў. З нашага боку адбудзецца прэзентацыя некалькіх выданняў, прысвечаных літаратуры гэтай краіны, а беларускія літаратурныя часопісы выпусцілі з такой нагоды тэматычныя нумары.

Што датычыцца айчынных кніг, то для наведвальнікаў ужо падрыхтавалі сваю прадукцыю такія знакавыя выдавецтвы, як «Мастацкая літаратура» і «Беларуская Энцыклапедыя», цікавую прэзентацыю абяцае сёлета паказаць Нацыянальная бібліятэка. Дарэчы, пабываць на выстаўцы — добрая нагода сустрэцца з беларускімі аўтарамі, сёлета Саюз пісьменнікаў Беларусі будзе прадстаўляць не толькі вядомыя кнігі і заслужаных дзеячаў. Чытачы пазнаёмяцца з творчасцю літаратараў з абласных аддзяленняў СПБ.

Калі хто не паспеў на ўрачыстасці, прысвечаныя 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, той мае шанц падхапіць «апошні акорд» на выстаўцы-кірмашы. На цэнтральнай выставачнай пляцоўцы пройдзе прэзентацыя ўсіх знакавых выданняў, прысвечаных гэтай тэме. Будзе там і друкарскі станок XVI стагоддзя, які эксплуатуецца ці не апошні раз для шырокай публікі.

Па словах Алены Паўлавай, галоўныя тэмы ў праграмах беларускіх удзельнікаў, акрамя 500-годдзя кнігадрукавання, раскрыюць перад наведвальнікамі яшчэ і асаблівасці малой радзімы, як яе бачаць майстры слова. «Беларусь — разгорнутая кніга» і «Мастацкае слова — сяброўства без межаў» стануць слоганамі мерапрыемства.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■

ООО «ГИРИЗ»
**ГИДРАВЛИКА:** гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
**ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ**
Самые конкурентные цены
**В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА**
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
**ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.**
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
**girza.by**
УНП 691586696

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Черейщина» (УНП 300039150)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Комбайн картофелеуборочный полуприцепной ПКК-2-02, 2006 года выпуска начальная цена 5 849,10 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Лепельский р-н, аг. Черейщина (территория хозяйства) |
| Место, дата и время проведения торгов | 14.03.2018 г. в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1). Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс. (80212) 610424, (8033) 6879148. www.vitebskjust.gov.by |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 13.03.2018 г. Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

■ Тры пытанні да ўлады

# ЛЮБАНЬ СТАНЕ ДРУГОЙ СТАЛІЦАЙ ШАХЦЁРАЎ

## І павялічыцца на шэсць тысяч чалавек



**За мінулы год Любанскі раён паказаў добрыя вынікі ў развіцці: прамысловасці, будаўніцтве, аграпрамысловым комплексе, гандлі, выканаў усе паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. А гэта значыць, зроблены выдатны зачын для далейшага росту эканамічнага патэнцыялу раёна, дабрабыту людзей. Чаго ўдалося дасягнуць і што плануецца зрабіць сёлета, на што перш за ўсё трэба звярнуць увагу, расказаў «Звяздзе» старшыня Любанскага райвыканкама Сяргей КАЗЕЦКІ:**

— Станоўчая дынаміка назіраецца практычна ва ўсіх сферах. Летась 13 суб'ектаў гаспадарання раёна разнастайных формаў уласнасці экспартавалі тавараў на 6,9 млн долараў ЗША ў чатырнаццаць краін свету, найбольш з іх — замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Уніфораст» і замежнае прыватнае таварыства «Любанская фабрыка адзення». На іх долю прыпадае 82 % ад агульнага аб'ёму. На 8,4 % павялічыўся экспарт паслуг і дасягнуў 457 тысяч долараў ЗША. Экспартуюць іх 9 прадпрыемстваў. Найбольшы аб'ём паслуг — 76 % — аказвае філіял «Санаторый «Рассвет-Любань» ААТ «Белаграздраўніца». У эканоміку раёна прыцягнута больш як 42 млн долараў ЗША прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове. Асноўная сума іх прыходзіцца на замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Слаўкалій» за кошт рэалізацыі праекта па будаўніцтве Нежынскага горна-абагачальнага камбіната.

Летась па валавой вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі раён выйшаў на 101 % да ўзроўню 2016-га. Падкрэслю, даводзілася нялёгка менавіта таму, што ў папярэднім годзе па гэтым паказчыку прыбавілі на 18 %. У сельскай гаспадарцы будзем выкарыстоўваць напрацоўкі мінулага года. У 2017-м пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылі на 5 тысяч, і статак налічвае 55 тысяч галоў. Цяпер будзем займацца больш актыўна селекцыйнай работай, уладкаваннем фермаў для камфортнага ўтрымання грамадскага статка. Ужо вядзецца будаўніцтва новых памяшканняў для жывёлы, сёлета запланаваны ўвод у дзеянне малочна-даільнай залы і двух жывёлагадоўчых памяшканняў на 600 месцаў у ААТ «Урэцкі». Актыўна ідуць работы таксама ў ААТ «Палессе-Агра», «Юрковічы», «Асавец-Агра». Асноўную стаўку будзем рабіць на далейшае развіццё жывёлаводчай галіны. Раслінаводства ў нас больш-менш стабільнае, нягледзячы на тое, што даводзіцца працаваць у даволі няпростых умовах, на выпрацаваных мінералізаваных тарфяніках. Сёлета плануем атрымаць валавы збор збожжавых каля 80 тысяч тон і 10 тысяч тон зерня кукурузы. Раён цалкам забяспечаны травяністымі кармамі. З улікам росту пагалоўя будзем прапарцыянальна павялічваць і нарыхтоўку кармоў.

Летась актыўна займаліся будаўніцтвам, добраўпарадкаваннем. Работы вяліся на 92 аб'ектах інфраструктуры горада і раёна. Гэта ўладкаванне мастоў, дарожнага пакрыцця, паркаў і сквераў. Практычна няма ніводнага месца ў горадзе і раёне, якое б не закранулі перамены.

**— Відаць, такая ўвага да інфраструктуры, сацыяльнай сферы звязаная з будаўніцтвам Нежынскага горна-абагачальнага камбіната?**

— З уводам камбіната ў дзеянне да 2020 года тут спатрэбіцца каля дзвюх тысяч спецыялістаў, адпаведна павялічыцца і колькасць насельніцтва ў горадзе, па самых сціплых ацэнках — на шэсць тысяч чалавек. Зразумела, для таго каб прыняць столькі людзей, неабходна падрыхтаваць інфраструктуру, стварыць годныя ўмовы жыцця. Сёлета запланаваны рамонт дзвюх школ, двух жылых дамоў. Плануем узвесці дом для маладых спецыялістаў-медыкаў, якія прыедуць у раён, — дагаворы ўжо заключаны. Такім чынам мы зможам цалкам укамплектаваць штат цэнтральнай раённай бальніцы, пазбавіцца ад чэргаў. Закупляем таксама сучаснае медыцынскае абсталяванне.

Паводле плана шматпавярховай забудовы горад будзе кампактна пашырацца ў заходнім напрамку. Прадугледжана ўвесці дамы для будаўнікоў «Слаўкалію». У канцы кастрычніка мінулага года быў здадзены арэндны дом, куды засяліліся ў першую чаргу тыя, хто стаяў на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у райвыканкаме. Гэта ўрачы, работнікі культуры, настаўнікі, медыкі, шматдзетныя сем'і.

**— Сяргей Іванавіч, на вашу думку, ці паспрыяюць такія грандыёзныя перамены развіццю прыватнай ініцыятывы?**

— У раёне прадпрымальніцкую дзейнасць ажыццяўляюць 584 суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, з іх 129 малых прадпрыемстваў і 437 індывідуальных прадпрымальнікаў. Яны займаюцца рознымі відамі дзейнасці: выраб мэблі, рамонт, будаўніцтва, гандаль, аўтатранспартныя паслугі. Прыватную ініцыятыву ніхто ў раёне не абмяжоўваў і да гэтага. Цяпер жа яна набывае дадатковы штуршок, паколькі колькасць насельніцтва павялічваецца. Адпаведна, патрабуецца і большы аб'ём паслуг, пашырэнне іх відаў. Тут, лічу, павінны працаваць паралельна і дзяржаўныя, і прыватныя структуры.

Мы гатовы падтрымліваць прыватнікаў. Бо разумеем: гэта новыя рабочыя месцы. Напрыклад, вядзецца газаправод, узводзіцца электрастанцыя, якая будзе беспераробойна забяспечваць «Слаўкалій» энергіяй. Тут патрэбны спецыялісты, электрыкі. Будуецца чыгуначная лінія ад Урэчча да Любані. Неабходныя машыністы цягнікоў, абслуговы персанал. З'явяцца гандлёвыя аб'екты — зноў жа патрэбны кадры. Хочаце — прыходзьце, працуйце, але толькі сумленна, адкрыта і празрыста.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# ПРАФЕСІЯ Ў ФОТА

**Учора ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася перасоўная выстава «Выратавальнік» з уласных фондаў Бабруйскага гаррайаддзела па НС.**



На фотаздымках яскравыя моманты барацьбы чалавека з вогненнай стыхіяй, яго дзеянні ў надзвычайных сітуацыях, пры аварыях. Прафесіяналізм трапіўшых у аб'ектыў камеры сведчыць сам за сябе. — Вельмі хацелася, каб гэта чапляла і нагадвала ўсім, якое ж крохкае наша жыццё, як важна берагчы яго і не ствараць пагрозы сваімі дзеяннямі для іншых, — кажа **аўтар праекта старшы інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па НС Дзмітрый СКАЗАЎ.**

Перасоўная выстава мае і гістарычны блок, дзе расказваецца пра станаўленне пажарнай справы. Дапаўняюць яе аварыйна-выратавальнае абсталяванне, баявое адзенне і іншыя прыналежнасці ратавальнікаў.

У дні выставы супрацоўнікі МНС арганізуюць для наведвальнікаў спецыяльныя тэматычныя заняткі, дзе раскажуць пра сваю мужную прафесію і навучаць асновам бяспекі жыццядзейнасці. У планах паказаць выставу ва ўсіх раённых цэнтрах Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Учынак

## Антона ўзнагародзілі за чуласць

**На сходзе вучняў школы № 35 Брэста яе вучня Антона Муху адзначылі граматай абласнога ўпраўлення МНС і каштоўным падарункам.**

Некалькі дзён таму пяцікласнік з бацькамі ехаў у машыне па вуліцы Суворава. Было гэта позним вечарам. Бацька ўважліва сачыў за дарогай, маці драмала на заднім сядзенні. Хлопчык заўважыў агонь на даху аднаго з дамоў прыватнага сектара і сказаў дарослым. Бацькі спачатку адмахнуліся, маўляў, здалося, вячэрнія ліхтары гараць. Але сын праявіў настойлівасць, і бацька Антона развярнуў машыну. Калі пад'ехалі да дома, дах якога быў ахоплены полымем, гаспадары нават не падазравалі, што гараць. Яны пакінулі жыллё, супрацоўнікі МНС, якіх выклікалі, хутка ліквідавалі пажар. А людзі не пацярпелі дзякуючы менавіта ўважлівасці Антона і яго неабыякавасці!

Грамату і планшэт з мабільнай праграмай «МНС Беларусі: дапамога побач» пяцікласніку ўручыў начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Канстанцін ШАРШУНОВІЧ.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Алімпіяда-2018

# Не ўсё тое золата, што блішчыць

### За што змагаюцца атлеты на Алімпійскіх гульнях?

**За дзесяць дзён на п'едэстал Гульняў-2018 падымаліся прадстаўнікі 26 краін свету. Сярод іх спартсмены такіх невялікіх і не зімовых дзяржаў як, напрыклад, Ліхтэнштэйн і Аўстралія. Беларусь з дзвюма ўзнагародамі знаходзіцца на 15-й пазіцыі медальнага заліку, гэта вышэй за нашых суседзяў — украінцаў (18 месца) і расіян (20 радок). Першыя — нарвежцы, на рахунку спартсменаў са Скандынавіі 26 узнагарод, 9 з іх — залатыя. Столькі ж медалёў найвышэйшай пробы ў Германіі, якая знаходзіцца на другім радку медальнага спісу.**



Так выглядаюць медалі Алімпіяды-2018.

Дарэчы, ці ведаеце вы, чаму такі медальны залік называецца неафіцыйным? Міжнародны алімпійскі камітэт не прызнае яго, бо, паводле Алімпійскай хартыі, Гульні — гэта спаборніцтвы не краін, а спартсменаў у індывідуальных ці камандных відах спорту. Такія медальныя табліцы пачалі з'яўляцца з Алімпіяды 1908 года, падставай паслужыла ініцыятыва члена МАК ад Італіі Юска, які абвясціў аб сваім рашэнні ўзнагародзіць тую краіну, прадстаўнікі якой выступяць на Алімпіядзе найбольш паспяхова.



А такія ўзнагароды атрымлівалі чэмпіёны Алімпійскіх гульняў у 1908 годзе.

Першапачаткова ў неафіцыйным камандным заліку ўлічваліся толькі медалі: залаты прыносіў краіне 3 ачкі, сярэбраны — 2, бронзавы — 1. Таксама ўжывалася схема 5-3-1. А пачынаючы з Гульняў-1924 набраў папулярнасць варыянт, паводле якога ачкі налічваліся за першыя шэсць месцаў (па ліку фіналістаў у асобных дысцыплінах Алімпійскай праграмы). З таго часу метады налічэння ачкоў мяняліся яшчэ шмат разоў, зараз яны таксама могуць быць розныя: улічваецца альбо агульная колькасць медалёў, альбо прыярытэт аддаецца залатым. У гэтым выпадку краіна, якая мае ўсяго адзін медаль, але залаты, будзе размяшчацца ў табліцы вышэй за краіну, у якой некалькі сярэбраных і ніводнага залатога, а пры роўнай колькасці залатых медалёў вышэй размяшчаецца краіна, у якой больш сярэбраных.

Дарэчы, Міжнародны алімпійскі камітэт сёння ўключае ў сябе 207 Нацыянальных алімпійскіх камітэтаў, прадстаўнікі 74 з іх яшчэ ні разу не станавіліся прызёрамі Алімпійскіх гульняў.

### З чаго зроблены медалі Алімпіяды-2018

Узнагароды Гульняў у Паўднёвай Карэі аказаліся самымі цяжкімі ў гісторыі Алімпіяд. Вага найвышэйшай узнагароды — 586 грамаў. Пры гэтым яны не самыя вялікія, рэкорд належыць медалям, якія былі разыграны ў Турыне, іх дыяметр складаў 107 міліметраў (у Карэі 92,5). А вось самыя мініяцюрныя ўзнагароды ўручалі чэмпіёнам лонданскіх Гульняў 1908 года. Яны былі крыху большыя за тры сантыметры ў дыяметры і важылі ўсяго 21 грам. Затое рабілі гэтыя ўзнагароды з чыстага золата. Калі б так было і цяпер, то кошт сучасных медалёў даходзіў бы да 20 тысяч долараў. Таму золата ў іх дадаецца толькі часткова. На дадзены момант рэкорд па суме выдаткаў на адзін медаль утрымліваюць Гульні ў Рыа-дэ-Жанэйра 2016 года — тры тысячы долараў за штуку.

Цяперашнія ўзнагароды стварыў паўднёва-карэйскі дызайнер Lee Suk-woo. На адным баку можна ўбачыць алімпійскія кольцы, размешчаныя на фоне драўнянай структуры. У карэйскай культуры ствол дрэва сімвалізуе ўпартую працу, якую трэба прарабіць, каб стварыць нешта новае. Краі медалёў упрыгожваюць надпісы на карэйскай мове (хангыле — нацыянальным карэйскім алфавіце). На адваротным баку медаля прадстаўлена назва адпаведнага віду спорту, а таксама лагатып Алімпіяды ў Пхёнчхане.

Як бы дзіўна гэта ні было, алімпійскі залаты медаль зроблены з серабра, а зверху пакрыты шасцю грамамі золата. Такое патрабаванне ўсталяваў Міжнародны алімпійскі камітэт. Атрымліваецца, што залаты медаль Алімпіяды ў Паўднёвай Карэі змяшчае 580 грамаў серабра і шэсць грамаў золата чысцінёй 999,9. Каб разлічыць намінальны кошт каштоўных металаў, дастаткова паглядзець штодзённыя курсы для золата і серабра. Паколькі яны ўвесь час мяняюцца, то і разлік будзе прыкладным, але блізкім да ісціны. Такім чынам, мы маем наступнае: 580 грамаў серабра каштуюць каля 250 еўра, а шэсць грамаў золата каля 205 еўра. Атрымліваецца, што выніковы намінальны кошт залатога медаля Алімпіяды-2018 складае прыкладна 455 еўра.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Прававая прастора

# РЫЭЛТАРЫ, МЕДЫЯЦЫЯ І АЛІМЕНТЫ

## Якія змены плануе сёлета Мінюст

**Больш жорстка рэгламентаваць дзейнасць рыэлтарскіх агенцтваў, пашырыць сферу дзейнасці працэдуры медыяцыі і спрасціць спагнанне аліментаў з даўжнікоў у краінах Еўрапейскага саюза плануюць сёлета ў Міністэрстве юстыцыі. Пра гэта расказаў міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

### Няпэўная рэклама і прымус да дагавора

Нараканняў на дзейнасць рыэлтарскіх арганізацый, нягледзячы на работу па прафілактыцы правапарушэнняў, якую праводзіць Мінюст, як і раней, хапае. Найбольш часта грамадзяне скардзяцца на прымус патэнцыйных пакупнікоў да заключэння дагавора на аказанне паслуг пры адсутнасці фактычнага іх ажыццяўлення, размяшчэнне недакладнай рэкламы нерухомасці і пазначэнне няпоўнай інфармацыі пра іх. А таксама прыцягненне да аказання рыэлтарскіх паслуг асоб, якія не маюць адпаведнага пасведчання.

Дзеля паляпшэння сітуацыі ва Указ Прэзідэнта № 15 «Аб рыэлтарскай дзейнасці» рыхтуюцца дапаўненні і змяненні. У прыватнасці, у дакумент плануецца ўнесці норму, якая будзе забараняць адной і той жа рыэлтарскай арганізацыі пры заключэнні дагавораў адначасова аказваць паслугі і пакупніку, і прадаўцу. Мяркуецца таксама прадугледзець абавязковасць наяўнасці дагавора на рэкламу аб'екта нерухомасці.

— Гэта робіцца, каб агенцтвы больш не маглі «падхапіць» рэкламу, выстаўленую ў інтэрнэт уласнікам жылля, і прапаноўваць патэнцыйным пакупнікам ад свайго імя, — растлумачыў міністр. — Мы таксама плануем прадугледзець нормы, якія ўстанаўлівалі б больш дакладны парадак у размяшчэнні падобных аб'яў з боку агенцтваў нерухомасці.

### Не даводзіць справу да суда

Летась у краіне распачаты праект па ўкараненні медыяцыі ў загсах. Пры адсутнасці непаўналетніх дзяцей і маёмасных прэтэнзій пара можа скарыстаць спрошчанай працэдурай скасавання шлюбу і зрабіць гэта ў загсе, а не ў судзе. Такім людзям прапануюць сустрэцца з медыятарам, каб урэгуляваць свае адносіны і пашукаць магчымасць захаваць шлюб.

— Ужо ёсць выпадкі, калі муж з жонкай пагаджаліся на працэдуру медыяцыі. Яны не падавалі заяву на скасаванне шлюбу, а бралі паўзу, каб знайсці пункты судакранання, — пракаментаваў міністр юстыцыі. — Нават калі гэта мела месца ў адным ці двух выпадках, мы ўжо лічым, што ёсць пэўны вынік.

Сёлета міністэрства плануе прапанаваць уключыць медыяцыю ў некаторыя заканадаўчыя акты Беларусі. Працэдуру медыяцыі збіраюцца ўвесці ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і, Грамадзянска-працэсуальны кодэкс і, магчыма, у Крымінальны кодэкс. Такая ініцыятыва існуе ў тым ліку і з боку дэпутатаў.

— Неабходна, каб гэтая працэдура прымянялася больш шырока і актыўна, паколькі медыяцыя — сапраўды прагрэсіўны спосаб урэгулявання канфлікту. Такая працэдура найменш балючая для бакоў і ў пэўнай ступені можа знізіць нагрузку на суды, — лічыць Алег Сліжэўскі.

### Аліменты з Еўрасаюза

Ратыфікаваная нашай краінай у сакавіку 2017 года Канвенцыя аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых формаў утрымання сям'і ўступіць у сілу сёлета ў чэрвені. Яна будзе забяспечваць аператыўны разгляд просьбаў па аліментных абавязках і дасць грамадзянам універсальны і даступны інструмент для спагнання аліментаў, упэўнены міністр.

— Сёння існуюць праблемы са спагненнем аліментаў, калі даўжнік знаходзіцца, напрыклад, у адной з краін Еўрапейскага саюза, з якой у Беларусі дагаворныя адносіны не развіты настолькі, каб дакументы аб спагнанні няўхільна прымаліся да выканання. У такіх выпадках усё залежыць ад волі дзяржавы, у адрас якой накіроўваецца запыт, — растлумачыў ён. — Калі канвенцыя ўступіць у сілу для Беларусі, будзе дзейнічаць працэдура, згодна з якой на тэрыторыі абсалютнай большасці краін ЕС і некаторых іншых, дзе сёння ёсць праблемы са спагненнем выканаўчых дакументаў па аліментах, будзе дзейнічаць працэдура іх абавязковага прызнання і выканання.

### Пакетны прынцып

Міністэрства юстыцыі шукае шляхі спрашчэння заканадаўства і спрабуе зрабіць яго даступным для разумення не толькі юрыстаў, а і любога грамадзяніна, якога датычацца пытанні, што рэгулююцца ў нарматыўна-прававых актах (НПА), агучыў міністр чарговы план.

Ініцыятывы па ўдасканаленні падрыхтоўкі праектаў НПА міністэрства ўнесла ў праект новай рэдакцыі Закона «Аб нарматыўна-прававых актах Рэспублікі Беларусь». Адна з прапаноў — магчымасць рэалізацыі пакетнага прынцыпу падрыхтоўкі праектаў НПА, якія датычацца канцэптуальна новых падыходаў ва ўрэгуляванні тых ці іншых праваадносін або ўводзяць рэгуляванне новых.

— Калі рыхтуецца новы закон ці акт, здараецца, што на стадыі падрыхтоўкі распрацоўшчыкі яшчэ не бачаць дэталёва, як тыя ці іншыя праваадносіны будуць урэгуляваны ў падзаконных актах. А пасля прыняцця закона пры падрыхтоўцы пастановы ўрада ўзнікаюць пытанні, бо ў законе нешта не прадугледзелі, — растлумачыў сутнасць пакетнага прынцыпу Алег Сліжэўскі. — Таму сёння разам з законам або актам кіраўніка дзяржавы адначасова рыхтуецца праект пастановы Саўміна і міністэрстваў. Так усе ўзроўні прававога рэгулявання новых праваадносін будуць дэталёва відаць на самай першай стадыі.

**Ірына СІДАРОК**

# СЛЯЗІНКА ДЗІЦЯЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведамілі **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Віталь КУЛЬБІЦКІ**, сексуальны гвалт у адносінах да дзяцей часцей за ўсё здзяйсняе чалавек, добра ім знаёмы альбо родны, — да 80 %. Для большасці выпадкаў інцэсту не патрабуецца прымяненне фізічнай сілы: дарослы чалавек, якому дзіця бязмежна давярае, маніпулюе яго свядомасцю, наўмысна падмянаючы яго і распавядаючы, што такія адносіны паміж дарослымі і дзецьмі з'яўляюцца нормай. Пры гэтым педафіл настойвае, што расказваць пра гэта нікому не варта, бо гэта з'яўляецца сакрэтам сям'і, альбо проста запалохвае тым, што дзіця можа апынуцца ў дзіцячым доме, бо тату ці маму пасадзяць у турму.

Стэрэатыпна лічыцца, што педафілія — гэта доля выключна мужчын, аднак у асобную катэгорыю можна вылучыць жаночы тып гэтага адхілення. Жанчыны-педафілы сапраўды сустракаюцца радзей, але пры гэтым іх дзеянні яшчэ больш латэнтныя. У першую чаргу гэта звязана з тым, што іх ахвярамі становяцца хлопчыкі, якія не заўсёды лічаць сябе пацярпелымі.

У гэтых адносінах паказальным з'яўляецца выпадак з грамадзянкай Беларусі, якая зарэгістравалася ў глабальным сецівe пад нікам Алеся. Праз інтэрнэт жанчына мела зносіны з жыхаром Германіі, займаючыся для яго на камеру дзеяннямі гвалтоўнага сексуальнага характару са сваім чатырохгадовым сынам. За кожны сеанс яна атрымлівала грашовыя сродкі ў суме 150 еўра. У дачыненні да жанчыны былі распачаты чатыры крымінальныя справы, яна асуджаная на 12 гадоў пазбаўлення волі. Асоба грамадзяніна Германіі таксама была ўстаноўлена мясцовымі спецслужбамі. У ходзе праверкі быў канфіскаваны яго сервер, пасля чаго высветлілі, што падобную сувязь ён падтрымліваў са шматлікімі жанчынамі па ўсім свеце.

### Запыт ад незнаёмых у дзяцей павінен выклікаць падазрэнне

У наш час вялікая частка такіх злачынстваў або ажыццяўляецца праз інтэрнэт, альбо праз яго вядзецца падрыхтоўка. Як паказваюць даследаванні, перш чым падысці да непасрэднага кантакту, педафілы цікавяцца дзіцячай парнаграфіяй. У Беларусі за апошнія гады колькасць выяўленых злачынстваў, звязаных з дзіцячай парнаграфіяй, вырасла ў дзявяць разоў. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў беларускім сегменце сеткі інтэрнэт матэрыялы адсутнічаюць, як правіла, такая прадукцыя размяшчаецца на замежных даменных рэсурсах.

Інтэрнэт педафілу патрэбны ў першую чаргу для таго, каб падабраць сабе ахвяру. Сюды ўваходзіць і збор інфармацыі, і ўцягванне ў зносіны, і стварэнне ўмоў, калі дзіця пачынае адчуваць сябе залежным. Паколькі сусветная сетка дазваляе ўсё рабіць на адлегласці, праз ананімныя анкеты, звычайна злачынцы прадстаўляюцца аднагодкамі сваёй патэнцыйнай ахвяры. Таму любы запыт ад незнаёмага дзіцяці можа выклікаць падазрэнне, бацькам лепш прасачыць, каб зносіны не выходзілі за межы нормы.

Менавіта ў сетцы інтэрнэт шукаў сабе ахвяраў грамадзянін Беларусі Антон — выканаўчы дырэктар адной з салідных фірмаў. З пачатку 2015-га па май 2016 года ён знаёміўся з загадзя малалетнімі і псіхалагічна рыхтаваў іх да сексуальнага кантакту. Падобныя дзеянні атрымалі назву «грумінг». Мужчына спачатку ўваходзіў у давер да дзяўчатак, а потым, абяцаючы вялікія заробкі, схіляў да занятку прастытуцыяй. Прапанаваны ганарар складаў ад 30 да 100 долараў ЗША. Увогуле было ўстаноўлена 38 пацярпелых, распачаты 42 крымінальныя справы. Пацярпелыя — дзяўчаткі 13—17 гадоў, у асноўным з неўладкаваных і няпоўных сем'яў. У кватэры зламысніка была знойдзена шырокая падборка кніг па дзіцячай псіхалогіі з асобнымі фразамі, падкрэсленымі маркерам, якія датычыліся таго, як прымусіць дзіця слухацца.

Адметнай рысай педафілаў, нягледзячы на аднастайнасць дзеянняў, з'яўляецца індывідуальны падыход да кожнага малалетняга. У ходзе размовы яны з лёгкасцю ўстанаўліваюць, чаго больш за ўсё не хапае дзіцяці: ці гэта будуць рэчы, цукеркі, ці ж проста спагада. Можна сказаць, што сваіх ахвяр педафілы імкнуцца выбіраць з ліку дзяцей, якія абдзелены ўвагай бацькоў, пры гэтым дабрабыт сям'і не мае значэння. Дзяцей з забяспечаных сем'яў яны матывуюць на зносіны тым, што гэты напрамак зараз у трэндзе і сорамна адставаць ад моды. У апошні час пачасціліся выпадкі падобных дзеянняў з боку педагогаў, урачоў, кіраўнікоў гурткоў і секцый — людзей, якім дзіця цалкам давярае. Гэта абумоўлена тым, што многія педафілы загадзя выбіраюць прафесіі, якія дазволяць ім пастаянна быць у асяроддзі дзяцей. Так, быў устаноўлены абуральны факт дзеянняў іншага сексуальнага характару ў дачыненні да васьмі хлопчыкаў з боку ўрача-анестэзіёлага, які працаваў з анкахворымі дзецьмі. Прамога гвалту не было, аднак ён дазваляў сабе дзеянні, якія выходзяць далёка за межы медыцынскай практыкі. Пры гэтым ён карыстаўся бездапаможным станам дзяцей. Мужчына атрымаў восем гадоў пазбаўлення волі.

### Кожнае пятае дзіця ў свеце

Ключавым пытаннем у дачыненні да гэтай праблемы з'яўляецца недасканаласць заканадаўчага рэгулявання. Зараз распрацоўваецца



законапраект аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальны кодэкс. У прыватнасці, павінна з'явіцца крымінальная адказнасць за захоўванне дзіцячай парнаграфіі і псіхалагічную падрыхтоўку дзіцяці да палавых зносін і іншых дзеянняў сексуальнага характару, так званы грумінг. Разглядаецца і вопыт замежных калег. Напрыклад, у Польшчы базы педафілаў былі выкладзены ў адкрыты доступ.

Падчас міжнароднай канферэнцыі «Супрацьдзеянне гандлю дзецьмі і сексуальнай эксплуатацыі дзяцей: вопыт Беларусі і замежных краін», якая прайшла ў Мінску, **кіраўнік праграмы «Ла Страда Беларусь» МГА «Гендарныя перспектывы» Алена НЕСЦЯРУК** расказала аб агульнасусветных тэндэнцыях у гэтым пытанні. Упраўленне ААН па наркотыках і злачыннасці ў адной са сваіх справаздач адзначае, што дзеці складаюць трэціну сярод усіх ахвяр гандлю людзьмі. Пры гэтым дзве трэціны дзяцей, якія пацярпелі ад гэтага, — дзяўчаткі. Нягледзячы на тое, што ў свеце павялічваецца колькасць ахвяр працоўнай эксплуатацыі, сексуальная эксплуатацыя застаецца пакуль пераважнай, асабліва, калі гаварыць пра дзяцей. Згодна з данымі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па аналізе 65 даследаванняў у 22 краінах, распаўсюджанасць сексуальнага гвалту над дзецьмі ў свеце ацэньваецца прыблізна ў 19,7 % у адносінах да дзяўчынак і 7,9 % у дачыненні да хлопчыкаў. Нягледзячы на тое, што самы высокі ўзровень падобных дзеянняў у Афрыцы, для Еўропы гэтая тэма таксама вельмі актуальная — 9,2 %.

Для дзяцей — ахвяраў сексуальнага гвалту сітуацыя з'яўляецца вельмі траўматычны, прыводзіць да доўгатэрміновых наступстваў, да якіх адносяцца спробы самагубства, дэпрэсіі, злоўжыванне алкаголем і наркотыкамі, перапыненне навучання ў школе, сексуальныя расстройствы, псіхічныя праблемы. Па даных шведскіх даследчыкаў, сярод дзяўчатак, якія перажылі сексуальны гвалт у дзяцінстве, 17 % мелі думкі пра самагубства, а больш за 30 % з іх рабілі падобныя спробы. З асяроддзя хлопчыкаў такія лічбы — 8 і 33 % адпаведна. Як паказваюць даследаванні, калі дзіця, якое перажыло падобнае, не атрымлівае дапамогу, то да 21 года каля 70 % з іх маюць сур'ёзныя псіхічныя адхіленні. Акрамя таго, многія трапляюць у секс-бізнес ці ж самі становяцца педафіламі. Таму гэта якраз той выпадак, дзе трэба ў першую чаргу працаваць на прадухіленне злачынстваў, а ўжо потым на пошук вінаватых.

**Дар'я КАСКО.**

■ Планы

# У РАЗВІЦЦЯ ПАСЛУГ НА ВЁСЦЫ ЁСЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ

## Шырокая сетка паштовых аб'ектаў па краіне будзе захоўвацца

**Пра перспектыўныя кірункі работы, вясковыя аддзяленні сувязі і развіццё інтэрнэт-гандлю генеральны дырэктар Белпошты Уладзімір МАТУСЕВІЧ расказаў на сустрэчы з журналістамі.**

За мінулы год прадпрыемства добра спрацавала па ўсіх эканамічных паказчыках. Але гэта не нагода расслабляцца: канкурэнцыя высокая.

— Мы не адзіны паштовы аператар у Беларусі, — заўважае Уладзімір Матусевіч. — А ў сферы распаўсюджвання прэсы працуе яшчэ 14 арганізацый. Але ў нашага прадпрыемства ёсць канкурэнтная перавага — шырокая сетка па ўсёй краіне. І мы плануем захоўваць яе, гэта важна. Прыватнікам не выгадна ісці ў рэгіёны, а мы бачым патэнцыял для развіцця паслуг у сельскай мясцовасці. Прырост у вясковым рытэйле ў нас штогод складае 10—15 працэнтаў.

Арганізоўваць гандаль у сельскіх аддзяленнях сувязі — гэта, дарэчы, міжнародная практыка. Так, у Швейцарыі пошта на вёсцы выглядае як невялікая крама.

Яшчэ адна міжнародная тэндэнцыя — супрацоўніцтва пошты і банка. У Расіі, напрыклад, гэтыя прадпрыемствы ў 2016 годзе аб'ядналіся ў адну структуру. У Беларусі супрацоўніцтва таксама наладжана, заключаны дагаворы на аказанне фінансавых, плацежных і банкаўскіх паслуг. У населеных пунктах, дзе няма банка, у аддзяленнях сувязі можна афармляць уклады, здымаць наяўныя з пластыкавай карткі, афармляць крэдыты.

Белпошта з'яўляецца таксама інфармацыйным пасярэднікам у дзяржаўных паслугах. У аддзяленнях можна атрымаць звесткі па зямельных участках, па справах аб банкрутстве, аб праве на капітальнае будаўніцтва.

У планах Белпошты на гэты год — выйсці з інтэрнэт-крамай прадпрыемства shop.belpost.by на новыя замежныя рынкі. Ужо цяпер тавары могуць дастаўляцца ў Расію, Украіну, Казахстан, Арменію, Кыргызстан і Германію.

Днямі былі падведзены таксама вынікі творчага конкурсу «Найлепшы матэрыял пра пошту» сярод друкаваных і электронных СМІ. У ім прынялі ўдзел каля ста журналістаў з усёй рэспублікі. Сярод іншых была адзначана і спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Наталля Лубнеўская, якая заняла трэцяе месца ў групе «Друкаваныя СМІ: рэспубліканскія, абласныя і гарадскія выданні» ■

■ Не працай адзінай

# «Пісаць улетку на прыродзе перашкаджаюць камары»

## Дызайнер паштовай прадукцыі стварае вечарамі карціны і выстаўляецца ў галерэях

**Мы часта скардзімся, што акрамя як на работу больш ні на што не хапае часу. Ірына ГАСПАДАРСКАЯ, дызайнер аддзела маркетынгавай стратэгіі ўпраўлення маркетынгу Белпошты, упэўнена: калі ёсць жаданне і натхненне, час можна знайсці. Вечарамі яна піша карціны. Часам настолькі паглыбляецца ў творчасць, што можа маляваць да пяці раніцы. Работніца пошты і мастачка ў адной асобе расказала, дзе самыя прыгожыя мясціны для пленэраў і чаго баіцца жывапісец, калі бярэ ў руку пэндзаль.**



Ірына скончыла Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «мастак-тэхнолаг лёгкай прамысловасці». Успамінае, што ў ВНУ ім стараліся даць па максімуме ведаў і вучылі ўсяму — і дызайну, і рэкламе. Пасля таго як атрымала дыплом, жанчына паўтара года працавала на трыкатажнай вытворчасці. Малявала там палотны, падбірала колеры, распрацоўвала мадэлі адзення. А потым стала больш цікавіцца рэкламай і пайшла ў сферу маркетынгу.

На пошце Ірына працуе шосты год. На ёй — дызайн рэкламнай прадукцыі. Лістоўкі, буклеты, каталогі, якія ляжаць у аддзяленнях сувязі, — яе рук справа. Жанчына адна з першых даведваецца пра новыя паштовыя паслугі. Некаторымі з іх і сама карыстаецца, напрыклад дастаўкай тавараў з інтэрнэт-крамы прадпрыемства.

— Заўсёды марыла, каб мая работа была звязана з творчасцю, — кажа Ірына.

Сярод яе сваякоў больш матэматыкаў і выкладчыкаў. Тата — ваенны, мама — медык. А Ірына з дзяцінства захаплялася жывапісам. Хадзіла ў дзве мастацкія школы. Цяпер стварае карціны ў сябе на кухні — уласнай майстэрні ў жанчыны няма.

— Люблю эксперыментаваць з тэхнікамі і матэрыяламі, — дзеліцца. — Але збольшага працую з алеем і акрылам. Для мяне важна ідэя: матэрыял і тэхніка выканання падбіраюцца ўжо пад яе. Адна з маіх любімых тэм — лялечны горад. Пры стварэнні гэтых карцін я стаgoing перадаць фактуру тканіны.

Падчас адпачынку Ірына любіць пісаць пейзажы з натуры. Раней часта ездзіла на пленэры на Віцебшчыну і Смаленшчыну (у гэтай расійскай вобласці цяпер жыве яе бацька) — кажа, там вельмі прыгожыя мясціны. «Пагуляць на прыродзе, пастаяць каля ракі вельмі прыемна. Толькі камары перашкаджаюць працаваць улетку», — усміхаецца суразмоўніца.

На мінскіх вуліцах замалёўкі яна пакуль не робіць. Усё збіраецца пачаць, але, прызнаецца, саромеецца публікі.

— Калі выходзіш з эцюднікамі (мальберт са скрыняй для фарбаў. — **Аўт.**), адразу прыцягваеш да сябе ўвагу. Але калі-небудзь я гэты страх пераадолею. Ужо ўсё падрыхтавала для гарадскога пленэру. Думаю, Верхні горад і Траецкае прадмесце — тое, з чаго можна пачаць. Яшчэ мне вельмі падабаецца вуліца Карла Маркса. Паштамт таксама хацела б намаляваць.

Колькі карцін ужо напісана, Ірына не лічыла. Але месца, каб іх захоўваць, не хапае катастрафічна. Мастачка дзеліцца: хочацца працаваць над вялікімі фарматамі, але такой магчымасці няма — дзе іх потым размясціш.

Некаторыя работы жанчына дорыць сябрам. Заўважае, што кожная карціна павінна дачакацца свайго гаспадара. Але ёсць і такія, з якімі Ірына не гатова расстацца. Адна з яе любімых карцін — эцюд з кветкамі. На ім намаляваны букет палявых кветак, якія ў летні дзень сабрала для мастачкі дачка.

Увогуле, за кожнай работай стаіць нейкая гісторыя. У кабінеце Ірыны ёсць карціна з анёлам світання — ён ўлятае ў ваконца ранняй раніцай і акуратна будзіць свайго гаспадара. А калі жанчына пісала закінуты калодзеж, змагла перадаць праблему вёсак, якія знікаюць.

Што адчувае мастак, калі бярэ ў руку пэндзаль? Аказваецца, страх белага ліста: думае, як бы не сапсаваць цудоўнае чыстае палатно. А яшчэ гадае, ці ўдасца рэалізаваць першапачатковую задуму. Бо карціна можа павесці ў іншы бок.

Цікавімся ў Ірыны, якія мастакі яе натхняюць. «Я заўсёды любіла імпрэсіяністаў — хто ж іх не любіць? Падабаецца творчасць Клімта, Босха, Брэйгеля».

***— Кажуць, што мастак мусіць быць галодным. Згодны?***

— Думаю, мастак павінен быць шчаслівым і лётаць, як матылёк, са сваім эцюднікам. Тады і работы пішуцца лёгка. Карціна мусіць выклікаць радасць.

***— Вы сама аптымістка?***

— Стараюся ёй быць, але мне над гэтым яшчэ трэба шмат працаваць, — адказвае з усмешкай суразмоўніца.

Ірына ставіцца да сябе вельмі крытычна і патрабавальна. Бывае, перапісвае карціны па некалькі разоў. Да сваёй работы «Калядная казка» яна 10 гадоў пастаянна вярталася, дапрацоўвала. Хоць некаторыя эцюды ствараліся літаральна за гадзіну.

Самыя прыгожыя месяцы, на думку мастачкі, — май, жнівень і верасень. А з пейзажаў, якія хацелася б напісаць, работніца пошты называе мора і горы. З задавальненнем бы з'ездзіла для гэтага ў Балгарыю ці Сербію.

13-гадовая дачка Ірыны, дарэчы, таксама вучыцца ў мастацкай школе. Толькі ў адрозненне ад мамы аддае перавагу акварэлі.

Пытанне, якое хвалюе многіх наведвальнікаў музеяў і выставак: як зразумець, што перад табой сапраўднае мастацтва? «Калі гэта напісана з душой, — упэўнена Ірына. — Не люблю, калі распінаюць чужыя карціны: гэта непрыгожа. У дзяцінстве ж усе малююць, а потым пачынаюць баяцца зрабіць не так, бо нехта пасмяецца. У дарослых гэты страх вельмі моцны. Але калі хочацца маляваць, не думайце, што скажуць іншыя. Проста купіце пэндзлік, фарбы і пішыце тое, што хочацца. Глядзець відэаўрокі я б не раіла, у іх ёсць мінус — могуць скіраваць на вузкую сцежку. Не трэба старацца капіраваць».

Ірына Гаспадарская выстаўляла карціны ў Мінску, Віцебску, Наваполацку, Смаленскай вобласці. Удзельнічала ў фестывалі народнай творчасці «Сузор'е», прафсаюзным конкурсе «Новыя імёны Беларусі». Летась адну з работ аднесла на выстаўку «Я Манэ, Я Шышкін, Я Малевіч». Калі цікавімся планамі, Ірына дзеліцца, што хоча вярнуцца да абстракцыі. Але падрабязнасці не раскрывае, кажа, у мастакоў не прынята агучваць задумы.

— Спакуса стаць вольным мастаком была, — прызнаецца дызайнер, — але рэклама для мяне таксама творчасць. І я не хачу адмаўляцца ад працы, якая прыносіць мне задавальненне ■

■ Філатэліст

# Марка ў гонар абаронцаў краіны

**У Цэнтральным доме афіцэраў адбылася цырымонія спецыяльнага гашэння паштовай маркі «100 гадоў Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь» на канверце «Першы дзень» памятным штэмпелем.**



Праект быў падрыхтаваны Белпоштай і Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі ў цесным узаемадзеянні з ваенным інфармацыйным агенцтвам «Ваяр». У аснове маркі і спецыяльнага штэмпеля — эмблема Узброеных Сіл нашай краіны. Тыраж маркі склаў 60 тысяч.

100-годдзе Узброеных Сіл адзначаецца 23 лютага. «На сённяшні дзень яны ўяўляюць сабой надзейны гарант міру на беларускай зямлі, з'яўляюцца своеасаблівым крытэрыем стратэгічнага стрымлівання. 23 лютага — гэта яркая дата ў нашай гісторыі, звязаная з патрыятызмам, мужнасцю і доблесцю людзей, якія ў розныя гады служылі і працавалі ва Узброеных Сілах Беларусі. Ужо сёння гэта маленькая марка будзе карыстацца попытам у філатэлістаў, а падзея 100-годдзя Узброеных Сіл увойдзе ў гісторыю», — адзначыў на мерапрыемстве **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ** ■

■ Рэгіёны

# Новае аддзяленне сувязі адкрылася ў Фаніпалі

**Паштовае аддзяленне Фаніпаль-1 па вуліцы Багдашэўскага, 2а будзе абслугоўваць восем тысяч жыхароў найбліжэйшых мікрараёнаў. Каб павысіць якасць і даступнасць паслуг, у ім арганізаваны тры аперацыйныя акны. Карэспандэнцыю і друкаваныя СМІ дастаўляюць тры паштальёны.**

У кліенцкай зале наведвальнікі могуць атрымаць пенсіі і дапамогі, адправіць лісты, пасылкі, грашовыя пераводы, падпісацца на газеты і часопісы, аплаціць камунальныя паслугі. Прадстаўлены шырокі асартымент паштовак, канвертаў, картак для пасткросінгу, марак. Устаноўлены таксама плацежна-даведачны тэрмінал для аплаты паслуг без камісіі.

Новае аддзяленне працуе з аўторка па пятніцу з 9.00 да 18.00, у суботу — з 9.00 да 15.00, у нядзелю — з 9.00 да 13.00. Панядзелак — выхадны.

У Дзяржынскім раёне гэта чацвёрты гарадскі паштовы аб'ект. Таксама на тэрыторыі раёна адкрыта 20 сельскіх аддзяленняў сувязі. Для аказання паслуг юрыдычным асобам ёсць «Бізнес-пошта».

Усяго на тэрыторыі Мінскай вобласці працуе 91 гарадское паштовае аддзяленне, 435 сельскіх, 27 перасовачных. У чацвёртым квартале плануецца адкрыць гарадскі аб'ект сувязі ў Барысаве ■

Матэрыялы падрыхтавала Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

# МІЛЬЯРДЫ КІЛАВАТ

## Пра электрычнасць дыстанцыйную, «камунальную» і скрадзеную

**Дыстанцыйнае ўзаемадзеянне са спажыўцом, «асабістыя кабінеты» на сайтах энергазабеспячальных арганізацый і заказ асобных паслуг праз інтэрнэт. Гэтыя і іншыя кірункі работы з насельніцтвам агучыў як галоўныя на шляху мадэрнізацыі прыбораў уліку электраэнергіі Сяргей ШАБЕКА, намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Белэнерга».**



### Індывідуальныя прыборы — у сістэмы

Сёння ў краіне дзейнічае 6822 аўтаматызаваныя сістэмы кантролю і ўліку электраэнергіі (АСКУЭ-быт), за кожнай з якіх сотні кватэр. Уласна электроннымі прыборамі ўліку забяспечана каля 37 % бытавога сектара краіны. Энергетыкі плануюць павялічваць іх долю і паступова свaімі сіламі далей аб'ядноўваць лакальныя індывідуальныя прыборы ў сістэмы.

**Цяперашнія спажыўцы электраэнергіі — гэта 280 тысяч юрыдычных асоб і 4,5 млн жыхароў шматкватэрных і індывідуальных дамоў. Разам яны спажываюць за год больш як 36 млрд кВт/г энергіі. Каля 190 тысяч спажыўцоў цеплаэнергіі выкарыстоўваюць за год больш як 34 млн Гкал цяпла. Пры гэтым амаль 60 % гэтай энергіі адпускаецца арганізацыям ЖКГ.**

— Каб павышаць эфектыўнасць узаемадзеяння са спажыўцом, мы паступова развіваем для насельніцтва і юрыдычных асоб інфраструктуру разлікова-сервісных даведачных цэнтраў, — заўважыў Сяргей Шабека. — Гэта месцы (сёння 26 спецыялізаваных цэнтраў), дзе можна атрымаць кваліфікаваныя адказы на ўсе пытанні, звязаныя з электразабеспячэннем.

Важным кірункам, які ў будучыні яшчэ больш будзе развівацца, спецыяліст лічыць таксама стасункі праз сетку інтэрнэт. Сёння на сайце кожнай энергазабеспячальнай арганізацыі створаны «асабісты кабінет», дзе спажывец можа завочна атрымаць увесь комплекс інфармацыі і нават заказаць некаторыя паслугі. У прыватнасці, па замене прыбора ўліку або атрыманні даведкі.

### Набываеш кватэру — правер «плацёжкі»!

Спецыяліст нагадаў таксама пра важнасць праверкі стану плацяжоў за электраэнергію пры набыцці жылля і пражыванні ў камунальных кватэрах. Па заяўцы спажыўца, электразабеспячальная арганізацыя бясплатна выдасць даведку аб аплаце сваіх паслуг. І пра гэта трэба дбаць, бо пры змене ўласніка здаралася, што папярэднія жыхары пасля продажу нерухомасці пакідалі неаплачанымі камунальныя паслугі, у прыватнасці за электрычнасць.

— Калі новыя ўласнікі з'язджаюцца разам, ім варта адразу дамовіцца, і лепш пісьмова, як яны будуць аплачваць паслугі ў камунальнай кватэры, каб пасля адстаяць свае эканамічныя інтарэсы, — параіў ён. — Калі на адзін прыбор уліку паступае недастаткова сродкаў ад саўладальнікаў, энергазабеспячальнай арганізацыі прыходзіцца працаваць праз суд і накладваць адказнасць на ўсіх уласнікаў кватэры. Хоць пасля высвятляецца, што адзін плаціць, а іншы — не.

Варта таксама памятаць, што калі спажывец — уласнік прыбора ўліку, то ўся адказнасць за яго стан ускладаецца на чалавека або на арганізацыю, якую калектыў уласнікаў выбраў для абслугоўвання шматкватэрнага жылфонду. Каб вызваліць чалавека ад неабходнасці абслугоўвання, прадугледжана магчымасць перадаваць прыборы ўліку і сістэмы АСКУЭ энергазабеспячальным арганізацыям.

Прадстаўнік «Белэнерга» заўважыў, што недаплаты за электрычнасць значна знізіліся. Пры гэтым большая іх частка лічыцца за сельгасарганізацыямі, а «насельніцтва — самы надзейны плацельшчык, які забяспечвае аплату ў больш як 99 %». Праўда, некаторыя працягваюць займацца безуліковым спажываннем энергіі. Летась, напрыклад, праз гэта было выкрадзена каля 151 млн кВт/г на 36,7 млн рублёў. Сяргей Шабека папярэдзіў, што для асоб, якія маюць намер бясплатна мець святло, мера адказнасці — жорстка адчувальная для бюджэту. Сума штрафу можа даходзіць да некалькіх тысяч рублёў.

**Ірына СІДАРОК.**

■ Грошы

# ІПАТЭКА — ГЭТА РЭАЛЬНА

## У краіне з'явіўся першы Цэнтр іпатэчнага крэдытавання

**У ім можна здзейсніць усе працэдуры для набыцця жылля — ад атрымання крэдыту да рэгістрацыі нерухомасці. БПС-Ашчадбанк адкрыў у сталіцы буйны Цэнтр іпатэчнага крэдытавання — першае ў краіне аддзяленне, у якім на працягу аднаго дня можна атрымаць жыллёвы крэдыт, ажыццявіць здзелку і зарэгістраваць аб'ект нерухомасці ў Мінску і Мінскім раёне. У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН, кіраўнікі дзяржорганаў і топ-менеджмент банка.**

«Працуем ва ўрадзе над стварэннем іпатэчнай формы ўзаемаадносін крэдытавання, плануем сёлета ўвесці форму іпатэчнага крэдытавання. Трэба вырашыць шэраг пытанняў у кампетэнцыі дзяржаўных органаў, для таго каб чалавеку было зручна і ён быў найперш абаронены — каб была прадастаўлена гарантыя банкаў і дзяржавы», — сказаў Анатоль Калінін.

Іпатэчны цэнтр адрознівае тое, што ў ім можна здзейсніць усе працэдуры для куплі жылля — ад атрымання крэдыту да рэгістрацыі нерухомасці. На рашэнне жыллёвага пытання пры наяўнасці дакументаў сыдзе ўсяго адзін дзень, тады як у звычайным аддзяленні толькі афармленне буйнога крэдыту займае некалькі сутак. На месцы можна заключыць дагавор аб іпатэцы і вырашыць іншыя пытанні, неабходныя для здзяйснення і рэгістрацыі здзелкі.

Цэнтр працуе ў рэжыме «адно акно»: у адным месцы дадуць пазыковыя сродкі, падрыхтуюць дакументы і аформяць здзелку. Для апошняй задачы арганізавана працоўнае месца дзяржаўнага рэгістратара Мінскага гарадскога агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. У якасці прыярытэтнага кірунку — выдача насельніцтву крэдытаў з дзяржпадтрымкай па адрасным субсідаванні ў жыллёвым будаўніцтве, што прадугледжана Указам № 240.

З адкрыццём цэнтра ў банку плануюць павялічыць хуткасць разгляду крэдытных заявак. Дзякуючы аптымізацыі ўнутраных працэсаў, рашэнне аб выдачы крэдыту будзе прымацца на працягу аднаго дня. Услед за хуткасцю вырасце і колькасць выдаваемых пазык. У планах банка на 2018 год — давесці аб'ём рознічнай крэдытнай запазычанасці да 620 млн рублёў. Фізічным асобам на фінансаванне нерухомасці плануецца прадаставіць 130 млн рублёў, у тым ліку 95 млн — у выглядзе крэдытаў з дзяржпадтрымкай.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ На слыху

# А ЎНАЧЫ ЁН ВЯРТАЎСЯ...

## І заходзіў у незачыненыя кватэры

**У сталіцы праваахоўнікі затрымалі 40-гадовага непрацуючага ўраджэнца Мядзела, які падазраецца ў здзяйсненні серыі кватэрных крадзяжоў.**

Было ўстаноўлена, што зламыснік у дзённы час сутак хадзіў па паверхах жылых дамоў і шукаў незачыненыя тамбуры і кватэры. Калі ён знаходзіў такія, то вяртаўся ў начны час сутак, асцярожна заходзіў у незачыненыя кватэры і выкрадаў рэчы, якія захоўваліся ў пярэдніх пакоях, пасля чаго сыходзіў. Прапажу сваёй маёмасці грамадзяне, як правіла, выяўлялі на наступную раніцу. Каб застацца незаўважаным, мужчына стараўся выбіраць дамы, не абсталяваныя сістэмай відэаназірання або па суседстве з якімі не размешчаны аб'екты, што знаходзяцца ў поле агляду відэакамер.

Толькі ў Фрунзенскім раёне сталіцы, паводле інфармацыі райупраўлення міліцыі, зламыснік падазраецца ў здзяйсненні чатырох падобных крадзяжоў з кватэр дамоў па вуліцах Прытыцкага, Сердзіча і Жудро. Зламысніку ўдалося завалодаць кашалькамі грамадзян, у якіх знаходзіліся грашовыя сродкі на агульную суму больш за чатыры тысячы рублёў, а таксама ноўтбукам. Акрамя гэтага, у праваахоўнікаў ёсць падставы меркаваць, што мужчына можа быць датычны да здзяйснення шэрагу аналагічных злачынстваў на тэрыторыі Мінска, Мінскай вобласці, а таксама Расійскай Федэрацыі. Вядома таксама, што раней ён неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за здзяйсненне аналагічных злачынстваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


Руководствуясь ст. ст. 93, 94 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», управляющий извещает всех заинтересованных лиц о том, что собрание кредиторов в отношении Общества с ограниченной ответственностью **«Компакт-транс»** (УНП 691780604) по защите требований кредитора – МКСК «Минск-арена» состоится **20.03.2018 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 68, каб. 801.**

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытое Акционерное Общество «Лепельагросервис» (УНП 300590110)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-11115, площадь – 1156,2 кв. м, 1988 года постройки, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – станция технического обслуживания, начальная цена 63 120,00 рублей;<br>Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-12798, площадь – 540,1 кв. м, 1988 года постройки, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз МТС, хранилищ, наименование – здание склада, начальная цена 23 040,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Витебская область, Лепельский р-н, г. Лепель, Минское шоссе, 157-й км |
| Место, дата и время проведения торгов | 14.03.2018 г. в 15.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1). Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879148. www.vitebskjust.gov.by |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 13.03.2018 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

**Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, проводимых на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»**

| № Лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 200218003 | Башенный кран КБ-408 (заводской № 56, год выпуска – 1989) | 48 620,00 | 4 900,00 |
| 200218004 | Башенный кран КБ-403 (заводской № 1598, год выпуска – 1985) | 40 106,00 | 4 100,00 |
| 200218005 | Башенный кран КБ-403 (заводской № 123, год выпуска – 1986) | 40 106,00 | 4 100,00 |
| 200218006 | Башенный кран КБ-403 (заводской № 1232, год выпуска – 1982) | 40 106,00 | 4 100,00 |

**Местонахождение предметов торгов**: г. Минск, ул. Селицкого, 27А.
**Шаг электронных торгов** – 5 %

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) электронных торгов по истечении 10 (десяти) банковских дней с момента определения Победителя электронных торгов (Претендента на покупку).
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на электронных торгах Предмета (Предметов) электронных торгов в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
5. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) – нерезидент Республики Беларусь оплачивает стоимость приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов в российских рублях, долларах США (по соглашению сторон) по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату, оговоренную в договоре купли-продажи. Ставка налога на добавленную стоимость при продаже предметов электронных торгов нерезиденту Республики Беларусь (экспорт) в соответствии с Налоговым Кодексом Республики Беларусь устанавливается в размере ноль (0) процентов

**Дата и время начала проведения электронных торгов 27 марта 2018 года с 11.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований «Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.
**Продавец**: ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-10-20, (+375 29) 179-06-36.
**Организатор электронных торгов:** ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-10-20, (+375 29) 179-06-36.
**Оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.
Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УМ № 79» (Лот № __________), проводимых 27 марта 2018 г. Перечисление задатка производится не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – 22.03.2018 г. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.
Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».
**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами**: 22.03.2018 г. в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – Щуцкий Алексей Александрович, тел. +375 (29) 179-06-36. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП « ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.)

■ Індыкатары якасці

# «РЭЦЭПТЫ» ПАСПЯХОВАЙ ШКОЛЫ

## Чаму багаж ведаў без умення іх прымяніць — гэта чамадан без ручкі?

**Вясной бягучага года каля шасці тысяч беларускіх падлеткаў з больш чым 220 устаноў адукацыі ўпершыню прымуць удзел у Міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў (PISA). Адно з самых аўтарытэтных даследаванняў якасці адукацыі ў свеце заклікана даць адказ на пытанне: ці выконвае адукацыя сваю асноўную функцыю — падрыхтоўкі да самастойнага жыцця? Правяраюцца не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў, колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі, здольнасць вучняў устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, іх уменне супастаўляць факты і аналізаваць, хутка прымаць рашэнні.**




### ЖЫЦЦЁВЫЯ ЗАДАЧКІ

На думку **дырэктара дэпартамента па адукацыі Арганізацыі па эканамічным супрацоўніцтве і развіцці (АЭСР), галоўнага куратара PISA Андрэаса ШЛЯЙХЕРА,** адукацыя павінна быць компасам у складанай і нестабільнай абстаноўцы. «Папярэдняе пакаленне настаўнікаў лічыла, што матэрыял, які яны выкладаюць, будзе карысны вучням на працягу ўсяго жыцця. Але сёння школы павінны рыхтаваць вучняў да беспрэцэдэнтных перамен у эканоміцы і навакольнай рэчаіснасці, да работы на працоўных месцах, якія яшчэ не створаны; да выкарыстання тэхналогій, якія не вынайдзены, — лічыць ён. — Працай кажучы, **свет узнагароджвае людзей ужо не за тое, што яны ведаюць, а за тое, як яны могуць выкарыстоўваць тое, што ведаюць.** Сёння гэта галоўны фактар, які вызначае адрозненні ў педагагічных стратэгіях. Актуальнымі цяпер становяцца разнастайныя камбінацыі ведаў, навыкі, якасці характару, якія могуць прывесці да поспеху ў кар'еры. Упор у сучаснай адукацыі павінен рабіцца на развіццё творчага пачатку, крытычнага аналізу, умення вырашаць праблемы і прымаць рашэнні. Калі паглядзець на праблему праз прызму натуральных навук і ў той жа час гісторыі, філасофіі, то такі падыход можа быць паспяховым».

У даследаванні PISA ўдзельнічаюць15-гадовыя падлеткі. Такі ўзроставы цэнз выбраны невыпадкова. Фактычна ва ўсіх краінах свету менавіта ў гэтым узросце навучэнцы заканчваюць базавы этап адукацыі і вызначаюцца з далейшай жыццёвай і адукацыйнай траекторыяй.

Тэсты PISA, якія доўжацца дзве гадзіны, змяшчаюць тры асноўныя блокі: заданні на чытацкую адукаванасць (разуменне тэкстаў), матэматычную і прыродазнаўча-навуковую. У іх шмат тэкстаў, якія трэба ўважліва прачытаць (а для сучасных школьнікаў, якія не любяць вялікія тэксты, гэта, бадай што, самае складанае) і адказаць на шматлікія пытанні. Яны ідуць групамі, з прывязкай да канкрэтнага тэксту.

Кожны раз акцэнты ў даследаванні змяшчаюцца. Асноўная ўвага падчас апошняга маніторынгу ўдзялялася прыродазнаўча-навуковай адукаванасці і выяўленню тэндэнцый развіцця прыродазнаўча-навуковай адукацыі ў свеце за апошнія гады. У цыкле 2018 года найперш будзе правярацца чытацкая адукаванасць, а ў 2021 годзе ўпор будзе зроблены на матэматычную.

Даследаванне PISA-2015 праводзілася цалкам на камп'ютарнай аснове з выкарыстаннем новага тыпу інтэрактыўных задач, якія ўяўлялі сабой камп'ютарную сімуляцыю. Напрыклад, вывучалася тэрмарэгуляцыя арганізма чалавека падчас забегу на доўгія дыстанцыі ва ўмовах павышанай тэмпературы і (ці) вільготнасці паветра. Камп'ютарная сімуляцыя давала магчымасць навучэнцам змяняць тэмпературу паветра і ўзровень вільготнасці, а таксама вар'іраваць умовы — спажывае бягун ваду ці не спажывае і гэтак далей.

**Якасць адукацыі ў краіне не можа быць вышэйшая за якасць падрыхтоўкі настаўнікаў, якія працуюць у школах.**

У тэсты быў уключаны таксама кампанент супрацоўніцтва — даследчыкаў цікавіла здольнасць навучэнцаў працаваць у камандзе. Падлеткам прапаноўвалася ў стасунках з нейкімі віртуальнымі партнёрамі сумесна абмеркаваць і вырашыць практычную праблему: арганізаваць, напрыклад, вытворчасць маек або стварэнне школьнай газеты і г. д. Гэта значыць, патрабавалася змадэляваць працэс узаемадзеяння паміж людзьмі і ацаніць, наколькі прадукцыйна вучань умее ўзаемадзейнічаць. Дадатковым кампанентам стала вывучэнне фінансавай дасведчанасці падлеткаў.

### У ЧЫМ САКРЭТ СІНГАПУРА?

У рамках PISA, акрамя непасрэдна правядзення тэстаў, збіраецца таксама інфармацыя аб навучэнцах (сацыяльна-эканамічным становішчы сям'і, стаўленні да вучобы, задаволенасці школай і сістэмай ацэньвання, фактах дыскрымінацыі ў навучальнай установе і г. д.), апытваюцца прадстаўнікі школы, аналізуецца сістэма адукацыі ў цэлым. Гэта дае магчымасць не проста ацаніць паспяховасць вучняў у розных краінах, а вызначыць, якія фактары спрыяюць дасягненню высокіх вынікаў.

Між іншым, вынікі PISA кожны раз цягнуць хвалю дыскусій — як унутры краін-удзельніц, так і на міжнародным узроўні. У Францыі б'юць трывогу з-за няроўных умоў у доступе да якаснай адукацыі і састарэлых метадаў выкладання. У ЗША абмяркоўваюць мэтазгоднасць адзінага агульнадзяржаўнага стандарту і шукаюць эфектыўныя шляхі для прыцягнення ў школы лепшых настаўнікаў.

У 2015 годзе найлепшыя вынікі паказаў Сінгапур. Пры гэтым сінгапурскія школьнікі прадэманстравалі высокія вынікі па ўсіх трох кампанентах комплекснага экзамену — чытанні, матэматыцы і прыродазнаўчых навуках. За ім размясціліся Японія, Эстонія, Тайпей (Кітай) і Фінляндыя. Праўда, іх вынікі па розных кампанентах тэста адрозніваліся — хтосьці паказаў лепшыя веды па матэматыцы, хтосьці — па чытацкай адукаванасці. У першую дзясятку рэйтынга ўваходзяць таксама Тайвань, Фінляндыя, Макаа (КНР), В'етнам, Ганконг і буйныя гарады КНР.

Пэўны час існавала думка, што высокія пазіцыі краін Усходняй Азіі ў міжнародным даследаванні абумоўлены празмернай вучэбнай нагрузкай і зазубрываннем матэрыялу. І калі ў PISA ўпершыню быў уведзены крытэрый творчай здольнасці да вырашэння праблем, многія эксперты чакалі абвальвання рэйтынгаў ці, ва ўсялякім разе, зніжэння паказчыкаў паспяховасці навучэнцаў усходнеазіяцкіх краін. Але іх чаканні не спраўдзіліся. У тым жа Сінгапуры адбылася «ціхая рэвалюцыя», якая засталася амаль незаўважанай на Захадзе. На першы план там выйшла развіццё творчага і крытычнага мыслення, сацыяльных навыкаў, эмацыянальнай спагадлівасці. Асноўнай задачай сучаснай адукацыі ў Сінгапуры з'яўляецца стварэнне асяроддзя, якое б стымулявала жаданне ў кожнага грамадзяніна вучыцца на працягу ўсяго жыцця. Ужо ў трохгадовым узросце ў дзіцячых дашкольных установах Сінгапура пачынаецца адукацыйны працэс, у дзяцей развіваюцца такія навыкі, як чытанне (на дзвюх мовах), лічэнне, музыка, маляванне, канструяванне, фарміруецца творчы погляд на навакольны свет.

**Упор у сучаснай адукацыі павінен рабіцца на развіццё творчага пачатку, крытычнага аналізу, умення вырашаць праблемы і прымаць рашэнні.**

«Калі вучні сфакусіраваныя на запамінанні і рэтрансляцыі таго, што сказаў ім настаўнік, гэта працуе толькі больш-менш пры вырашэнні лёгкіх задач. І гэта адна з прычын таго, чаму многія ўсходнееўрапейскія краіны, уключаючы Расійскую Федэрацыю, паказваюць нізкі вынікі у PISA. Проста запамінанне ўжо не гарантуе поспех, — упэўнены Андрэас Шляйхер. — Значна больш эфектыўным інструментам з'яўляецца здольнасць спалучаць новую інфармацыю з ужо засвоенай».

**Даследаванне PISA праводзіцца кожныя тры гады, а затым на працягу яшчэ аднаго года аналізуюцца вынікі тэстаў, перш чым яны будуць прадстаўлены сусветнай грамадскасці. Першы рэйтынг быў складзены ў 2000 годзе. Вынікі апошняга агучаны 5 снежня 2016 года. У PISA-2015 удзельнічалі 536 тысяч школьнікаў з 71 краіны, а PISA-2018 ахопіць ужо 82 краіны. Беларусь, Украіна і яшчэ 9 краін будуць у ім навічкамі.**

### УПОР НА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ НАСТАЎНІКАЎ

Арганізатары PISA лічаць, што вынікі тэстаў уяўляюць сабой аб'ектыўны інструмент для ацэнкі якасці сістэмы адукацыі ў той ці іншай краіне. Па выніках папярэдніх даследаванняў Арганізацыяй па эканамічным супрацоўніцтве і развіцці былі створаны мадэлі, якія дазваляюць прадказваць вынікі вучняў у розных краінах на аснове аналізу прынятых рашэнняў у адукацыйнай палітыцы з дакладнасцю 85 працэнтаў.

Адна з іх высноў — якасць адукацыі ў краіне не можа быць вышэйшая за якасць падрыхтоўкі настаўнікаў, якія працуюць у школах. Вынікі PISA сведчаць, што лепшыя сістэмы адукацыі адбіраюць, навучаюць і падтрымліваюць лепшых настаўнікаў. Напрыклад, поспехі фінскай школы ў першую чаргу звязваюць з павышэннем патрабавальнасці да вынікаў працы настаўніка і адначасовым пашырэннем аўтаноміі ў яго рабоце. Конкурсы на педагагічныя спецыяльнасці ў Фінляндыі — адны з самых высокіх: для таго каб на іх паступіць, неабходна належаць да трацціны найлепшых выпускнікоў школы па выніках агульнанацыянальных іспытаў.

**Усе краіны, якія палепшылі свае паказчыкі ў PISA, прытрымліваюцца паслядоўнай палітыкі па паляпшэнні якасці педагагічнага складу.** Там ствараюць стымулы для самых паспяховых навучэнцаў, каб заахвоціць іх да педагагічнай дзейнасці, павышаюць заработную плату настаўнікам, каб зрабіць прафесію больш прывабнай, або заахвочваюць настаўнікаў, каб тыя ўдзельнічалі ў трэнінгах і педагагічных праграмах.

Адносна неабходнага фінансавання аналіз PISA паказвае, што выдаткі на адукацыю, бясспрэчна, важныя, аднак яны ўплываюць на паспяховасць толькі да пэўнай мяжы. Павелічэнне фінансавання дапамагае бедным краінам. Калі ж выдаткі на вучня перавышаюць $50 000, то простае павелічэнне фінансавання не дадае значнага прыросту ў ведах. Пры гэтым прыватныя школы не з'яўляюцца выключэннем. Славакія, якая выдаткоўвае на аднаго вучня каля $53 000, мае такія ж вынікі, як ЗША, якія выдаткоўваюць на аднаго вучня $115 000. Далейшы рост паказчыкаў адукаванасці залежыць ад эфектыўнасці выкарыстання фінансавых і матэрыяльных сродкаў. Большую карысць прыносяць выдаткі на падрыхтоўку настаўнікаў і павышэнне іх кваліфікацыі.

Эксперты PISA ўпэўнены, што сістэма адукацыі можа спрыяць высокай матывацыі да навучання, калі яна забяспечвае стаўленне да ўсіх вучняў як да патэнцыйна паспяховых. Толькі калі сістэма адукацыі культывуе, стымулюе і падтрымлівае веру ў тое, што ўсе вучні могуць дасягнуць больш высокіх поспехаў, тыя адчуваюць жаданне дзейнічаць і дасягаюць лепшых вынікаў. Што з'яўляецца агульным для ўсіх паспяховых краін — дык гэта прызнанне важнасці адукацыі і засяроджванне грамадскіх рэсурсаў і высілкаў на яе пастаянным удасканаленні.

**У тым жа Сінгапуры адбылася «ціхая рэвалюцыя», якая засталася амаль незаўважанай на Захадзе. На першы план там выйшла развіццё творчага і крытычнага мыслення, сацыяльных навыкаў, эмацыянальнай спагадлівасці.**

Беларусь пакуль не ўдзельнічала ні ў якіх міжнародных маніторынгавых даследаваннях, таму ўсе разважанні пра «якасць» выпускнікоў, якая быццам бы пагаршаецца, можна спісаць на суб'ектыўнасць такіх ацэнак. Напэўна, для таго, каб канстатаваць, што дасягненні або праблемы і сапраўды маюць месца, вельмі карысна ўбачыць сябе на фоне дасягненняў і праблем сістэм адукацыі іншых краін. Але ёсць і пэўныя апасенні: **яшчэ ніколі краіны, якія толькі далучыліся да даследавання, не дэманстравалі адразу высокія вынікі. Таму галоўнае — зрабіць правільныя высновы з агучаных рэкамендацый.**

У красавіку — маі мінулага года ў нашай краіне адбыўся пробны этап тэсціравання PISA, у якім прынялі ўдзел 66 устаноў адукацыі. Падчас яго праводзілася тэсціраванне камп'ютарнай тэхнікі, апрабіраваліся заданні, прадстаўленыя міжнароднымі арганізатарамі, вялася падрыхтоўка адказных асоб для правядзення асноўнага даследавання. Пробны этап паказаў, што тэхнічна і арганізацыйна Беларусь гатовая да правядзення асноўнага этапу тэсціравання PISA. Што пакажа даследаванне, мы зможам даведацца толькі ў снежні 2019 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# «НЯМА НА ЗЯМЛІ ТАГО ШЧАСЦЯ І ГОРА...»

**Спадзяёмся, што многае з гэтай гутаркі зацікавіць і нашых чытачоў, і тых, хто працуе з беларускай мовай па сваіх службовых абавязках, і педагогаў. Атрымалася яна надзвычай аўтарытэтная і прафесіянальная, бо ўдзельнічалі ў ёй людзі, якія маюць да беларускай філалогіі самае непасрэднае дачыненне: Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, доктар філалагічных навук, першы намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, Алена АНІСІМ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, старшыня Таварыства беларускай мовы, Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі, Віктар ІЎЧАНКАЎ, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, Ірына КАНДРАЦЕНЯ, кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, вучоны сакратар Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры НАН, Ірына БУДЗЬКО, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай і рускай моў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Кацярына ГАНЧАРЭНКА, кандыдат філалагічных навук, дактарант Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, Уладзімір КОШЧАНКА, загадчык сектара камп'ютарнай лінгвістыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа.**

**«Звязда»:**

***— Адна з тэндэнцый апошняга часу — беларускую мову пачалі больш шырока ўжываць у розных сферах нашага жыцця. На ёй размаўляе і перапісваецца ў сецiве моладзь, на ёй пачынае гаварыць наш бізнес, яна ўсё часцей гучыць у храмах... На думку тых, для каго мова — не толькі сродак зносін, але і прадмет вывучэння, гэта шырая зацікаўленасць ці ўсё ж больш даніна нейкай модзе, якая ў хуткім часе міне?***

**Алена АНІСІМ:**

— Я са свайго досведу грамадскага дзеяча хачу зазначыць, што людзі прыходзяць да беларускай мовы па розных прычынах. Нехта натуральным шляхам: для яго гэта штодзённая мова і ён не стаіць перад пытаннем, на якой мове яму гаварыць. Іншыя людзі ўпершыню сутыкаюцца з жаданнем карыстацца беларускай мовай ужо ў сталым узросце: хтосьці быў вызвалены ад яе вывучэння ў школе, хтосьці пераехаў у Беларусь з іншай краіны. Для моладзі, якая з дзяцінства гаварыла па-руску, нешта паслужыла штуршком — і з'явілася жаданне гаварыць на беларускай мове штодня. Словам, у грамадстве адбываюцца розныя працэсы, але можна сказаць упэўнена, што цікавасць да беларускай мовы сёння ёсць і яна не змяншаецца. У многіх дарослых людзей ёсць патрэба ёй карыстацца, і не толькі самім карыстацца, але даць магчымасць і сваім дзецям гэта рабіць. Мы бачым, як беларускамоўныя бацькі гуртуюцца сёння, каб адкрываць беларускамоўныя групы ў дзіцячых садках, каб ствараліся беларускамоўныя класы ў школах. Нельга казаць адназначна, што гэта нейкая даніна модзе, ці цікаўнасць, ці штосьці яшчэ, — у кожнага свая патрэбнасць у мове. Але ў большасці тых, хто сёння свядома прыйшоў да беларускай мовы — для таго, каб вывучаць яе, пашыраць яе ўжыванне, лічу, патрэба натуральная, прадыктаваная разуменнем, што яны грамадзяне Рэспублікі Беларусь, што беларуская мова дзяржаўная, а значыць, трэба, каб яна гучала ў нашай краіне.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**

— Тут варта найперш заўважыць, што мы жывём у асяроддзі беларускай мовы, і гэта асяроддзе, будзем спадзявацца, будзе пашырацца. Гэта і не мода, гэта і не цікаўнасць — гэта рэальнае жыццё беларускай мовы, як і любой жывой мовы.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**

— Сапраўды, у тым, што назіраем сёння, няма ніякай моды, ніякай экзотыкі. Сёння гэта нармальны, умераны ход развіцця натуральнай мовы. Ёсць, канешне, выпадкі аспрэчвання таго, што так адбываецца, але ў сваёй прафесійнай дзейнасці я, напрыклад, гэтага не адчуваю.

**«Звязда»:**

***— Цалкам рэальная на сённяшні дзень сітуацыя. Чалавек, у якога школа і ўніверсітэт, дзе па нейкіх прычынах ён не атрымаў дастатковай моўнай адукацыі, ужо даўно ў мінулым, вырашае для сябе, што будзе карыстацца беларускай мовай. Яму ёсць куды пайсці падвучыцца ці варта спадзявацца толькі на сябе, задавальняючыся чытаннем класікаў?***

**Ігар КАПЫЛОЎ:**

— Прывяду прыклад з работы нашага Інстытута мовазнаўства. Летась у нас узнікла ідэя арганізаваць навукова-асветніцкія курсы па беларускай мове. Мы падрыхтавалі праграму, распрацавалі план лекцый, зрабілі аб'яву, што такія курсы адкрываюцца. Шчыра кажучы, вялікага аптымізму накont ахвотных запісацца на гэтыя курсы не было, але я памыліўся. На заняткі прыйшлі прадстаўнікі розных пакаленняў, рознага ўзроўню: і школьнікі, і студэнты, і аспіранты, і перакладчыкі, і экскурсаводы, і праграмісты, і пенсіянеры. І пасля першых некалькіх лекцый ахвотных хадзіць на іх не паменела, як часам бывае. Курсы доўжыліся з кастрычніка да чэрвеня, а наведвальнікаў з цягам часу станавілася нават больш — людзі пачалі хадзіць цэлымі сем'ямі, прыводзіць сяброў. Калі мы пасля заканчэння зрабілі апытанне, агульнае пажаданне было працягнуць гэту справу, што мы, уласна кажучы, сёлета і зрабілі. Праўда, у іншым фармаце — далучыліся культуралагічны складнік і гістарычны, а пляцоўкай для правядзення заняткаў стаў Нацыянальны гістарычны музей...

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**

— Калі ў грамадстве ёсць патрэба вывучэння мовы, людзі не тое што адгукаюцца, а нават гатовыя плаціць за гэта грошы. Пасля таго як былі ўнесены змены ў беларускі правапіс, у Інстытуце журналістыкі на факультэце перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў былі створаны пастаянныя тэматычныя семінары і вебінары. На іх прайшло перападрыхтоўку звыш тысячы чалавек.

**Уладзімір КОШЧАНКА:**

— Можна, канешне, пайсці вучыцца за грошы, але мне здаецца, у адносінах да беларускай мовы гэта няправільны падыход. Бясплатныя курсы фактычна адсутнічаюць. «Мова нанова»? Але ж гэта не чыста моўныя курсы. Пры Таварыстве беларускай мовы былі менавіта моўныя курсы, на якіх людзі бясплатна вывучалі мову фактычна з нуля...

**Алена АНІСІМ:**

— Цяпер іх, на жаль, няма, бо паўстала фінансавае пытанне: выкладчыку ж трэба заплаціць за работу...

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**

— Я не думаю, што сітуацыю з курсамі беларускай мовы трэба драматызаваць. Усё з'яўляецца тады, калі ў гэтым з'яўляецца патрэба. Калі з'явіцца неабходнасць — праблемы не будзе, знойдуцца і выкладчыкі, і арганізацыі. У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў такіх курсаў была маса, бо была маса людзей, якія разумелі, што без ведання беларускай мовы яны не змогуць заняць тых пазіцый у грамадстве, на якія яны прэтэндуюць. Тое самае будзе і зараз, і сімптомы мы ўжо можам назіраць сёння. Будуць ахвотнія — будуць і курсы. Іншая справа, што гэту работу абсалютна нельга пускаць на самацёк, а трэба ствараць моўнае асяроддзе мэтанакіравана. У нас сапраўды не хапае беларускай мовы ў інфармацыйнай прасторы. Сёння вельмі важна, каб былі арганізаваныя адукацыйныя курсы на радыё. Калі б у ранішнім эфіры, калі людзі пад радыё збіраюцца на працу, прагучала 15-хвілінная праграма «Гаворым па-беларуску правільна», — плён быў бы несумненны. Важна, каб такія курсы былі на тэлебачанні. І вельмі надзённая сёння праблема — арганізацыя падобнай дзейнасці ў інтэрнэт-прасторы. Але гэта вельмі складана, бо сёння інтэрнэт не спрыяе культуры маўлення — як беларускага, так і рускага. І гэта звязана з тым, што адносіны і патрабаванні да агульнай культуры і культуры маўлення ў грамадстве вельмі знізіліся. Сёння нашай асноўнай праблемай з'яўляецца тое, што стала не сорамна пісаць і гаварыць з памылкамі, — так званая праблема моўнай кампетэнцыі.

**Уладзімір КОШЧАНКА:**

— А яшчэ, ведаеце, якая сёння праблема? На жаль, нават многія выпускнікі філфака ці журфака выходзяць з вельмі слабай беларускай мовай. Мне давялося сутыкацца з імі па працы, пры перакладзе на беларускую некаторых сайтаў — на жаль, у большасці менавіта нядаўніх выпускнікоў веды мовы, мякка кажучы, слабаватыя.

**«Звязда»:**

***— Ці не бяда гэта для мовы, калі моладзь са слабай падрыхтоўкай, з «асфальтавай» лексікай пачынае актыўна ёй карыстацца (што можна назіраць сёння ў вялікіх гарадах). Здаецца, час непакоіцца пра элементарную культуру маўлення, адсутнасць якой становіцца нормай...***

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**

— Мы павінны толькі радавацца, што з'яўляюцца новыя разнавіднасці мовы, што яна пашырае сферы ўжывання, і з'яўленне гэтых разнавіднасцей сведчыць пра яе паўнавартаснасць і поўнафункцыянальнасць. Мы павінны пазбавіцца ад такога стэрэатыпа, што калі мы гаворым пра беларускую мову, то маем на ўвазе перш за ўсё яе літаратурны варыянт. Але любая нацыянальная мова не зводзіцца толькі да літаратурнай разнавіднасці. У любой еўрапейскай мове сёння існуюць самыя розныя варыянты акрамя літаратурнага. Тое, што ў нас, нягледзячы на пэўныя праблемы з беларускай мовай у грамадстве, з'яўляюцца яе новыя разнавіднасці, у тым ліку сацыяльныя дыялекты, сведчыць, што беларуская мова пашырае сферу свайго выкарыстання, што яна з'яўляецца рэальным сродкам зносін пэўных частак нашага грамадства. Тым больш калі мы гаворым пра сацыяльныя дыялекты, то гэта якраз тая сфера зносін, дзе ніхто не можа прымусіць выкарыстоўваць тую ці іншую мову. І калі яна з'яўляецца ў такім асяроддзі — гэта значыць, што яна запатрабаваная.

Але трэба вельмі добра разумець, што кожная разнавіднасць мовы мае свае сферы ўжывання. У адной сферы будуць дарэчы народныя гаворкі, у другой — сацыяльныя дыялекты, у трэцяй — афіцыйная мова. Усе мы павінны разумець, што ў сферы навучання, асабліва школьнага, у афіцыйных сферах павінна без варыянтаў выкарыстоўвацца выключна дасканалая беларуская літаратурная мова.

**Уладзімір КОШЧАНКА:**

— Мне аднойчы давялося правесці дзень у беларускамоўнай гімназіі. Настаўнікі і дзеці па-за ўрокамі размаўлялі па-руску. Тое самае можна назіраць і ў ВНУ нават на профільных мовазнаўчых факультэтах. Адкуль можа моладзь, пазбаўленая моўнага асяроддзя дома, добра вывучыць мову, калі стаўленне да яе ўсяго толькі як да прадмета?..

**Алена АНІСІМ:**

— Мы якраз закранулі вельмі важнае пытанне інфармацыйнага забеспячэння, натуральнага моўнага асяроддзя. Менавіта праз яго недахоп, а то і адсутнасць, таму ж самаму маладому чалавеку мову немагчыма ні вывучыць на належным узроўні, ні тым больш удасканаліць. Мова ў нашай інфармацыйнай прасторы — на тэлебачанні, на радыё — абмежаваная. Мова інтэрнэту — без межаў, але ж там фактычна няма абмежаванняў і для элементарнай непісьменнасці.

**Кацярына ГАНЧАРЭНКА:**

— І ў плане інфармацыйнага забеспячэння вельмі важна, каб былі беларускамоўныя маладзёжныя праграмы на тэлебачанні. Некалькі гадоў назад была праграма «Легенды life», якая, на жаль, закрыла сезон, у другім сезоне тэлеконкурсу «Талент краіны» беларускай засталася толькі назва... Добра, што ёсць яшчэ беларускамоўны хіт-парад «100 песень для Беларусі», ну і некаторыя матчы на «Беларусь 5» каментуюцца па-беларуску.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**

— «Зафрэндзіць», «лузер», «юзер»... Як да гэтага ставіцца? А што за праблема, сябры мае? Гэта ж сёння не толькі беларускай мовы праблема — усіх моў свету. Мы ўвайшлі ў абсалютна новую эпоху, якая вымагае іншай лексікі. У 20-я гады мінулага стагоддзя, напрыклад, адбываўся адваротны працэс — прыхільнікі пурызму (чысціні мовы) навыдумлялі слоў, якія павінны былі замяніць запазычанні з іншых моў. Большасць новатвораў так і засталася ў гісторыі, але ж некаторыя сталі часткай літаратурнай мовы: цягнік, жыццяпіс, лецішча, сугаддзе... Гэта, як ужо тут неаднойчы казалі, натуральны працэс развіцця мовы. Мова з цягам часу сама адшліфуе, што застанецца ва ўжытку, а што пяройдзе «ў пасіў» у яе карыстальнікаў.

**Кацярына ГАНЧАРЭНКА:**

— Я сумесна з Анастасіяй Марозавай ужо два гады займаюся даследаваннем размоўнай і слэнгавай лексікі. Мы правялі апытанне маладых людзей ва ўзросце 17—32 гадоў (вынікі якога, дарэчы, публікаваліся ў часопісе «Маладосць»). Высветлілася, што больш свабодна размоўнай лексікай валодаюць людзі, якім ад 25 гадоў і якія прафесійна займаюцца беларускай мовай, — журналісты, пісьменнікі, людзі творчых прафесій. Яны паказалі найбольш цікавыя вынікі. У студэнтаў быў зафіксаваны пераважна слэнг з рускай мовы. А адна 19-гадовая дзяўчына з 35 панняццяў, якія трэба было абазначыць словамі, восем выразіла словамі «фіг», «крут»... Але выявілася і станоўчая тэндэнцыя: менавіта беларуская мова дазваляе зменшыць колькасць сапраўдных вульгарызмаў. У каментарыях маладыя людзі пазначалі: мы арыентуемся на нашых выкладчыкаў, на класічную літаратуру... Каля дваццаці працэнтаў паняццяў большасцю рэспандэнтаў або ніяк «па-размоўнаму» не называлася, або ўказваўся рускамоўны адпаведнік, што сведчыць пра тое, што беларуская мова ўсё ж успрымаецца як літаратурная, як мова навучання. А хацелася б, каб яна станавілася натуральнай.

Сярод апытанай моладзі мы заўважылі і новых пурыстаў, якія кожнаму слову стараюцца знайсці менавіта беларускі адпаведнік (гаманец, а не кашалёк, ровар, а не велік, файна, а не ніштяк). Яшчэ адна відавочная без анкетавання праблема: у побыце моладзь, на жаль, шмат ужывае ненарматыўнай лексікі, што сведчыць перш за ўсё пра нізкую культуру маўлення. Адной з прычын можна назваць вербальную агрэсію на тэлебачанні, у літаратурных тэкстах і нават у тэатральных пастаноўках.

**Алена АНІСІМ:**

— Гэта якраз асаблівасць маладзёжнай аўдыторыі: тое, што яны ведаюць, перарабіць для сваіх патрэб. Ім хочацца развіцця, нечага новага, і гэта трэба разумець, бо так яно было, ёсць і будзе. Пытанне толькі, што яны выкарыстоўваюць для сваіх патрэб, якія веды. Моладзь заўсёды ў пошуку, і гэта адносна мовы вельмі добрая перспектыва развіцця.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**

— Мы можам толькі вітаць, што з'яўляецца маладзёжны слэнг як сацыяльны дыялект. Але трэба мець на ўвазе, што ў яго свае спецыфічнае кола носьбітаў, свая спецыфічная сфера выкарыстання. Гэта не значыць, што ён павінен пераносіцца на наша літаратурнае маўленне... Я, шчыра кажучы, быў бы не супраць, каб у беларускай мове з'явілася больш сацыяльных дыялектаў — ад ваеннага да крымінальнага жаргону. Бо гэта сведчанне таго, што мова натуральна ўжываецца сярод розных слаёў насельніцтва, а значыць, жыве і развіваецца.

**«Звязда»:**

***— У такім выпадку і мову інтэрнэту, сацыяльных сетак можна лічыць сацыяльным дыялектам? Толькі, калі глядзіш, што робіцца з мовай там, наўрад ці з'явіцца жаданне гэта вітаць...***

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**

— У інтэрнэт-камунікацыі мы фактычна маем справу з вусным маўленнем, якое атрымлівае графічную фіксацыю. І вельмі цяжка ад вуснага маўлення патрабаваць, каб яно строга прытрымлівалася літаратурных нормаў. А яшчэ наша бяда, што мы адвыклі глядзець у слоўнікі. Раней слоўнікі былі ў любой установе, дзе пісалі і гаварылі па-беларуску ці па-руску. Цяпер жа навошта слоўнік, калі праз «Гугл» усё можна пракласці. Вось і маем тое, што маем.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**

— Паводле вядомага даследавання Марціна Карноя, беларуская мова названая безмоўна жывой дзякуючы таму, што беларускамоўная інтэрнэт-прастора дастаткова запоўнена. Тая ж Вікіпедыя ў беларускім варыянце пастаянна дапаўняецца. А гэта ж калектыўная праца.

Што датычыцца нарматыўных слоўнікаў. Так, яны патрэбныя, але сёння чалавек звернецца хутчэй не да слоўніка-кнігі, а да партала gramota.ru ў інтэрнэце. І праблема беларускамоўнага асяродка ў тым, што ў нас сёння няма такой інфармацыйна-даведачнай аўтарытэтнай крыніцы ў сецiве. Чаму б не стварыць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.


Алена АНІСІМ.


Ігар КАПЫЛОЎ.


Віктар ІЎЧАНКАЎ.


Ірына КАНДРАЦЕНЯ.


Ірына БУДЗЬКО.


Кацярына ГАНЧАРЭНКА.


Уладзімір КОШЧАНКА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

агульнымі намаганнямі правапіс.by, напрыклад. Калі б у нашай прасторы быў такі інфармацыйна-даведачны партал, які б аб'яднаў усе крыніцы, усім было б нашмат прасцей, асабліва тым, хто хоча карыстацца мовай правільна.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— У нас яшчэ няма дастатковай культуры карыстання інтэрнэт-рэсурсамі. Бо там знаходзіцца столькі смецця, што адрозніць дакладную інфармацыю ад неправеранай (гэта датычыцца і правапісу, і ўжывання лексікі) вельмі складана. Так, тая ж gramota.ru добры рэсурс, але звычайны карыстальнік, чым корпацца ў слоўніках, якія прапануе гэты рэсурс, лепш набярэ тое, што яго цікавіць, у пошуку і возьме перш знойдзены варыянт, асабліва не сумняваючыся, правільны ён ці не.

**Уладзімір КОШЧАНКА:**
— Не ў тым праблема, што няма правераных рэсурсаў, — яны ёсць. Няма жадання звяртацца да іх або элементарных ведаў. Людзі вельмі слаба арыентуюцца ў беларускім інтэрнэце. Нават студэнты філфака не ведаюць самых элементарных беларускіх рэсурсаў, якія б ім дапамаглі. Мы зрабілі даступную праграму праверкі беларускай арфаграфіі для Microsoft Office і некаторых іншых праграм. Нават калі прапануеш — адмаўляюцца ёй карыстацца: маўляў, мы ў іншай праграме працуем. Прасцей выдаць тэкст з элементарнымі памылкамі.

**«Звязда»:**
***— Але гэта якраз той выпадак, калі трэба спадзявацца толькі на жаданне і свядомасць. Інакш адаб'еш ахвоту...***

**Алена АНІСІМ:**
— Хачу абазначыць яшчэ адзін аспект, з якім, напэўна, усе сутыкаліся. Людзі выстаўляюць патрабаванні да беларускай мовы, да беларускага маўлення як да эталоннага. «Чым гаварыць абы-як, лепш зусім не гаварыць». Гаварыць трэба бездакорна, хораша, прыгожа. Зразумела, што мы імкнёмся да ідэалу, зразумела, што падобныя патрабаванні адрасуюцца найперш публічнаму ўжыванню мовы — з вуснаў палітыкаў, культурных дзеячаў і г. д. Але ж варта разумець і тое, што патрабаванне жорсткае прыпыняе развіццё самой мовы.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Адзін з парадоксаў існавання нашай мовы — сапраўды завышаныя патрабаванні да культуры ўласнага маўлення і пры гэтым недастатковая моўная кампетэнцыя. Адбываецца гэта таму, што многія з беларускай мовай упершыню знаёмяцца ў яе літаратурнай форме — пачынаючы вывучаць яе ў школе. У аднамоўным асяроддзі людзі спачатку вучацца гаварыць на мове, а пасля вывучаюць яе правілы. А ў нас атрымліваецца наадварот — мы ведаем правілы, але не ўмеем гаварыць і арыентуемся на літаратурную мову. Канешне, мы сёння павінны вітаць любое беларускамоўнае маўленне, няхай сабе і з памылкамі, але трэба проста ўсведамляць, што ёсць сітуацыі, дзе павінен ужывацца толькі літаратурны варыянт мовы.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**
— Так, ёсць людзі, якія лічаць, што на мове трэба гаварыць эталонна. Але ёсць і іншы тыпаж людзей — яны не цікавяцца, не пытаюцца, не ніякавеюць, яны лічаць, што гавораць правільна, хаця гэта зусім не так.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Гэта нармальная сітуацыя. Ёсць жа размоўная сфера мовы, дзе падобнае будзе дарэчы. Тая ж трасянка на сённяшні дзень, па сутнасці, пачынае выконваць функцыю гарадскога прастамоўя — і гэта таксама натуральна.

**Алена АНІСІМ:**
— Трасянка — гэта спроба паяднаць у адну мову дзве і зрабіць нейкі камфортны субпрадукт для ўласнага выкарыстання. Пры гэтым не ўлічваецца, што моўныя сістэмы ў нас, нягледзячы на роднаснасць моў, абсалютна адрозныя. А трэба арыентаваць на гэта дзяцей змалку: што ёсць беларуская мова, ёсць руская і яны розныя.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Але трасянку мы не можам адмаўляць, таму што гэта натуральнае існаванне мовы ў двухмоўным асяроддзі. Яе ўжыванне пачне змяншацца толькі тады, калі пачне павышацца моўная кампетэнцыя, прычым і рускамоўная, і беларускамоўная.

**Ігар КАПЫЛОЎ:**
— І дзеля справядлівасці варта заўважыць, што, калі чалавек рускамоўны, нельга вывучыць мову, не прайшоўшы этапу трасянкі.

**Ірына КАНДРАЦЕНЯ:**
— У аснове ўсёй гэтай праблемы ляжыць моўная кампетэнцыя. Адукацыйны працэс на сённяшні дзень недастаткова забяспечвае гарадскога рускамоўнага вучня валоданнем правільнай беларускай мовай. Бо ўрок беларускай мовы адзін раз на тыдзень для гарадскога дзіцяці, якое больш яе фактычна нідзе не чуе, акрамя аб'яў у транспарце, — гэта вельмі мала. І як гэта дзіця зможа зарыентавацца ў тым, што ў падобных моў розныя сістэмы, калі яно абсалютна не падрыхтаванае? У сістэме школьнай адукацыі ў нас адносна беларускай мовы, на жаль, не забяспечана належная моўная практыка, якая павінна быць на самых розных узроўнях.

У 90-х гадах мову вучылі многія. Але там спрацоўваў прынцып абавязковасці — хутчэй псіхалагічны, чым юрыдычны. Чалавек сам для сябе ўсведамляў, што без ведання мовы ён можа не дасягнуць нейкіх вышынь у кар'еры, напрыклад. Цяпер жа размова ідзе хутчэй пра прынцып самасвядомасці — кім сябе чалавек адчувае на гэтай зямлі. Але спрацоўвае тут яшчэ і наша спрадвечнае: «Калі неабавязкова, то і навошта?»... Калі ў школьнай праграме было абавязковым вывучыць верш на памяць — і сёння сталыя людзі з лёгкасцю працытуюць Купалу або Коласа. А ці будзе хто вучыць тыя ж вершы проста таму, што яны напісаны па-беларуску? А матывацыі, акрамя самасвядомасці, у нас сёння фактычна няма.

**«Звязда»:**
***— Як бы там ні было, ёсць жа людзі, якія валодаюць мовай на вельмі прыстойным узроўні, пішуць і гавораць без памылак. І такіх людзей нямала. Адкуль жа тады столькі памылак на шыльдах, у рэкламе? Як зрабіць так, каб тыя, хто не ведае, як правільна, пракансультаваліся ў тых, хто ведае, асабліва калі размова ідзе пра афіцыйную, публічную сферу ўжывання мовы?***

**Ігар КАПЫЛОЎ:**
— Зараз надзённа гучыць ініцыятыва, каб у нашым інстытуце запрацавала адмысловая экспертная камісія, якая будзе аналізаваць у першую чаргу рэкламу, праводзячы лінгвістычную экспертызу. Задача лінгвістычнай экспертызы — на аснове аб'ектыўных крытэрыяў, заснаваных на існуючых у дзяржаўных мовах лексічных, граматычных, арфаграфічных, пунктуацыйных, стылістычных нормах, ацаніць правільнасць напісання рэкламнага тэксту на стадыі яго падрыхтоўкі, праверыць яго жанрава-стылістычную адпаведнасць і адпаведнасць літаратурным нормам беларускай і рускай моў. Цяпер жа такая экспертыза не праводзіцца нікім, таму маем тое, што маем. На жаль, пакуль гэта ініцыятыва не рэалізаваная, а яе трэба праводзіць на ўзроўні ўнясення змяненняў у заканадаўства аб рэкламе. Але цяпер ствараецца адпаведная рабочая група, і, спадзяюся, у хуткім часе мы будзем мець рэальны вынік.

На жаль, мы сапраўды жывём у непісьменным візуальным асяроддзі — маю на ўвазе афармленне шыльдаў, назваў вуліц. Самы свежы паказальны прыклад — напісанне назвы новай вуліцы Юрыя Семяняхі ў сталіцы. Пяць пад'ездаў — пяць варыянтаў напісання. У чым прычына? Не існуе ніякіх патрабаванняў, ніякай адказнасці для тых, хто гэтыя шыльды піша.

**Уладзімір КОШЧАНКА:**
— Калі мы займаліся падрыхтоўкай законапраекта аб геаграфічных назвах, я мэтанакіравана спрабаваў высветліць, хто адказны за напісанне назваў вуліц у сталіцы. Аказалася, што праўды тут не дабіцца. Калі ў меншых гарадах і пасёлках шыльды афармляюцца больш-менш аднастайна, то ў сталіцы — проста жах.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Такая служба, якая будзе кантраляваць візуальныя надпісы на прадмет правапісу на абедзвюх дзяржаўных мовах, сапраўды павінна быць. І павінна быць узаконена палажэнне, згодна з якім усе візуальныя публічныя надпісы павінны праходзіць адпаведную экспертызу. Калі б гэта было прынята на заканадаўчым узроўні, гэта дазволіла б больш строга патрабаваць выканання нормаў...

**«Звязда»:**
***— Калі казаць пра моўную кампетэнцыю. Нярэдка чуваць нараканні, што для складанага, напрыклад, навукова-тэхнічнага тэксту ў беларускай мове не хапае слоў...***

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Я з адказнасцю магу заявіць, што любы нават самы складаны навуковы тэкст можна з лёгкасцю выкласці па-беларуску. Слоў у мове хапае — праблема ў людзях, якія гэтых слоў не ведаюць. Я займаўся падрыхтоўкай беларускамоўнай часткі двух тэрміналагічных слоўнікаў — па парашковай металургіі і па ўласна металургіі. Абсалютна лёгка любыя тэрміны ў любой сферы дзейнасці або вытворчасці перадаюцца па-беларуску. Праблема нібыта недахопу слоў, лічу, надуманая.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**
— Вельмі важна тут заўважыць яшчэ вось што. Калі сёння афіцыйная мова яшчэ цягне з XX стагоддзя вось такія формы: «На сённяшні дзень патэнцыяльныя магчымасці развіцця эканомікі залежаць ад спецыфічных асаблівасцей функцыянавання народнай гаспадаркі...» — што гэта за мова? Хто ёй захоча карыстацца? Сёння праблему ўжывання афіцыйнай мовы трэба разглядаць праз прызму таго, як яе ачалавечыць. Гэтага патрабуе сама жыццёвая практыка. Калі б гэта запрацавала — і законы, і нарматыўныя акты былі б больш зразумелыя.

**Ірына КАНДРАЦЕНЯ:**
— Наша афіцыйная мова, асабліва ў заканадаўчай сферы, у свой час была запазычаная з рускай. Статут Вялікага Княства Літоўскага стаў асновай заканадаўчых актаў Маскоўскай дзяржавы. Шмат лексічных адзінак, якія зараз успрымаюцца як калькі, на самай справе вяртаюцца ў беларускую мову-крыніцу. А моўныя сістэмы, як ужо гаварылася сёння, у нас розныя.

**«Звязда»:**
***— Афіцыйную публічную мову сапраўды агульнымі намаганнямі можна прывесці да ладу. І нават устанавіць адказнасць за парушэнне нормаў. А вось беларуская мова ў асяроддзі нашых рэлігійных канфесій — пытанне больш далікатнае і складанае...***

**Ірына БУДЗЬКО:**
— На пачатку 90-х гадоў мы маглі сказаць, што ў касцёле адна беларуская мова, у царкве — другая. Сёння сітуацыя выраўнялася, нашы канфесіі ў большасці выпадкаў прыйшлі да моўнага паразумення. Значна вырасла моўная кампетэнцыя ў святароў, якія выкарыстоўваюць беларускую мову падчас богаслужэнняў. Іншая справа, што не дайшлі да адзінства тэрміналогіі, якая ўжываецца. Прычына ў тым, што ў аснове каталіцкага богаслужэння ляжыць лацінскі пераклад, у аснове праваслаўнага — грэчаскі. Ні адзін, ні другі не прыйшоў наўпрост у беларускую мову: у каталіцкім відавочнае польскамоўнае і чэшскамоўнае пасрэдніцтва, у праваслаўным — царкоўнаславянскае, што не магло не адбіцца на тэрміналогіі. Так што можна сказаць, што, калі ўжыванне каталіцкіх або праваслаўных тэрмінаў не пярэчыць моўнай сістэме, мы павінны гэту тэрміналогію прыняць. І з боку прадстаўнікоў канфесій назіраецца імкненне да моўнага кансэнсусу. Амаль пазбеглі ўжо ў праваслаўных служэннях дзеепрыметнікаў на -учы, -ючы, нехарактэрных для беларускай мовы, замяніўшы на канструкцыю складаназалежнага сказа... Пакрысе ў беларускамоўнай царкоўнай тэрміналогіі «дабро» перамагло «блага» (цяпер «Благовещенье» перакладаецца як «Дабравешчанне»). І гэта абсалютна лагічна, бо кожны, хто валодае беларускай мовай, скажа, што слова «блага» ў ёй мае выключна негатыўнае значэнне.

Іншая справа, калі гэта тэрміналогія прымяняецца не ў сакральным, а ў публічным штодзённым ужытку. Напрыклад, назвы рэлігійных свят. Тут дагэтуль няма адзінства. Асабліва гэта датычыцца Божага Нараджэння, Раства, Ражджаства, Нараджэння Хрыстовага — якіх толькі варыянтаў не пабачыш у віншаваннях на вуліцах і ў публічных месцах... Тое ж самае з Вялікаднем, Вяльканацам і Пасхай, з Тройцай і Сёмухай... Мы казалі пра неабходнасць экспертызы або кантролю ў іншых сферах ужывання мовы. Мне здаецца, і ў дачыненні да рэлігійнай лексікі гэта тэма актуальная, але, паўтаруся, толькі там, дзе гэтыя тэрміны публічныя, у штодзённым ужытку...

**«Звязда»:**
***— Падсумоўваючы ўсё сказанае сёння, які прынцып адносна ўжывання беларускай мовы актуальны больш: «Лепш менш, ды лепш» або «Абы карысталіся, навучымся ў працэсе»?***

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:**
— Тут найперш варта сказаць, што сёння беларуская мова павінна стаць фактарам аб'яднання, а не раз'яднання, яна павінна кансалідаваць наша грамадства, нашу нацыю. Для гэтага неабходна пазбавіць беларускую мову як палітычных, так і культурных ярлыкоў і супрацьпастаўленняў.

Што датычыцца выкарыстання мовы, я лічу, што трэба сёння прымаць і вітаць любое беларускае маўленне, але трэба строга разумець, што ёсць сферы, дзе павінен выкарыстоўвацца толькі літаратурны варыянт беларускай мовы.

**Ігар КАПЫЛОЎ:**
— Прынцып «Лепш менш, ды лепш» часта стрымлівае выкарыстанне беларускай мовы. Многія заяўляюць, што любяць і паважаюць роднае слова, але баяцца зрабіць памылкі, таму карыстаюцца рускай мовай. Таму я лічу, што трэба не баяцца памылак, у працэсе пастаяннага выкарыстання беларускай мовы іх колькасць будзе змяншацца. Дарогу можа пераадолець толькі той, хто ідзе, рухаецца.

**Алена АНІСІМ:**
— А яшчэ трэба стымуляваць выкарыстанне беларускай мовы, стымуляваць прафесіяналізм у яе выкарыстанні.

**Ірына БУДЗЬКО:**
— Трэба пашыраць узорнае беларускамоўнае маўленне, каб у тых, хто хоча правільна гаварыць па-беларуску, быў наглядны прыклад для пераймання.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ:**
— Я за тое, каб беларускай мовы было «больш і лепш». Ці ўдасца гэтага дасягнуць — залежыць не толькі ад усіх разам, але і ад кожнага паасобку.

**Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ОАО «Опытный завод металлоконструкций» проводит очередное собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр-т Пушкина, 68, зал заседаний, дата проведения собрания: 23 марта 2018 года, начало – 15.30.

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году и основных направлениях деятельности на 2018 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе за 2017 год.
3. Отчет о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества ревизионной комиссией за 2017 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2017 год.
5. Утверждение распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2017 год. О выплате дивидентов за 2017 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2017 год. Периодичность выплаты дивидентов за 2017 год.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений в Устав Общества.
9. Рассмотрение выполнения управляющей организацией ООО «КверкСтройИнвест» договора № 1 от 21 января 2016 года «О передаче полномочий единоличного исполнительного органа хозяйственного общества управляющей организации».
10. Разное.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 204-30-72

УНП 100135691

## ОАО «АМКОДОР-СЕМАШ» – управляющая компания холдинга», 222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19.
## Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества

Собрание состоится 26 марта 2018 г. в 14.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «АМКОДОР-СЕМАШ» – управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2018 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.
3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2017 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2018 год.
5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 6 марта 2018 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 21 марта 2018 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «АМКОДОР-СЕМАШ» – управляющая компания холдинга» (222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «АМКОДОР-СЕМАШ» – управляющая компания холдинга».

УНП 600005769

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ЧАЙКА», г. ГРОДНО

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 400/С-101260** (мастерская) общей площадью 29,2 кв. м, кирпичное, 1984 г. п., составные части и принадлежности: навес; **капитальное строение инв. № 400/С-101261** (бензохранилище) общей площадью 13,7 кв. м, бетон, 1961 г. п.; **капитальное строение инв. № 400/С-101243** (склад с гаражом и мастерской) общей площадью 1118,4 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: три пристройки, навес; **капитальное строение инв. № 400/С-101037** (здание гаражей с сауной) общей площадью 317,1 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: пристройка, асфальтобетонное покрытие, ограждение металлическое, ворота, калитка, канализационная сеть, водопроводная сеть; **многолетние насаждения** (4 шт.) | | |
| **Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Титова, 24** | | | |
| **Информация о земельном участке:**<br>кадастровый номер 440100000001000464, площадь – 0,3250 га, целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания автогаража*<br>**согласно действующему генеральному плану развития города Гродно, земельный участок, на котором расположены строения, находится в границах территории, на которой предусмотрено перспективное размещение общественной застройки и торгово-обслуживающих объектов, обустройство ландшафтно-рекреационной зоны (озеленение территории общего пользования) и инженерное оборудование, и данные капитальные строения по ул. Титова, 24 в перспективе развития города Гродно сохранению не подлежат* | | | |
| Начальная цена | **268 132 рубля 80 копеек с учетом НДС** | Задаток (3 %) | **8 044 рубля** |
| Сведения о продавце | ОАО «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8 (0152) 74 55 02 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65-BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 дней с даты подписания протокола о торгах. Условия оплаты: по договоренности сторон | | | |
| **Торги состоятся 23 марта 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов | **По 19 марта 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| **Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79** | | | |

## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 16 по генплану» опубликованным в газетах «Звязда» № 193 (28557) от 06.10.2017, № 245 (28609) от 20.12.2017

**Действуют скидки на стоимость 1 кв. м общей площади для 25 (двадцати пяти) квартир:**

**п**ри **единовременной** оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв. м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **100 (сто) долларам США.**

УНП 192400611

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Лот № 1.** Незарегистрированное капитальное строение площадью 230,8 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000002003518 площадью 0,1500 га, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 6-я Загородная, 109А. **Нач. цена:** 125 280 руб. **Задаток:** 12 528 руб.

**Лот № 2.** Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, наружной площадью 36 кв. м, с земельным участком площадью 0,2302 га, кадастровый № 222782007601000055, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, Лепельский с/с, д. Заньки, ул. Озерная, участок 15Б, целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания жилого дома. **Нач. цена:** 4 060,80 руб. **Задаток:** 406,08 руб.

**Лот № 3.** Капитальное строение с инв. № 710/С-10661, наименование – жилой дом 92, назначение – жилой дом, площадью 91 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, д. 92, расположенное на земельном участке с кадастровым № 741000000008000989. Составные части и принадлежности: две пристройки, сени, четыре сарая, баня, два гаража, уборная. **Нач. цена:** 17 486,28 руб. **Задаток:** 1 748,63 руб.

**Лот № 4.** Капитальное строение с инв. № 710/С-65839, наименование – гараж 415, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, площадью 41 кв. м, 2011 г. п., расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Днепровской Флотилии, 13/415 (ПГСК-20), расположенное на земельном участке с кадастровым № 741000000002000416. Составные части и принадлежности: подвал. **Нач. цена:** 6 055,56 руб. **Задаток:** 605,56 руб.

**Лот № 5.** Капитальное строение (одноэтажное каменное здание гаража спецмашин) с инв. № 240/С-31420 наименование – здание гаража спецмашин, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, площадью 1 315,7 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 223, расположенное на земельном участке с кадастровым № 242400000001001152 площадью 9,6120 га. **Нач. цена:** 97 076,88 руб. **Задаток:** 9 707,68 руб.

**Лот № 6.** Незарегистрированное изолированное помещение бытового корпуса с двумя галереями, тамбуром и пристройкой, расположенное в капитальном строении с инв. № 240/С-18206 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 39А/2-4, общей площадью 7 842,5 кв. м, на земельном участке с кадастровым №242400000001000582. **Нач. цена:** 464 964,48 руб. **Задаток:** 46 496,44 руб.

**Лот № 7.** Капитальное строение (одноэтажное каменное здание столовой) с инв. № 240/С-42956, наименование – здание столовой, назначение – здание специализированное для общественного питания, площадью 1 011 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. БелГРЭС, расположенное на земельном участке с кадастровым № 223656200001000013 площадью 2,1137 га. **Нач. цена:** 82 638 руб. **Задаток:** 8 263,80 руб.

**Лот № 8.** Капитальное строение с инв. № 200/С-47103 наименование – сборочный цех, назначение – здание специализированное иного назначения, площадью 989 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11М/2, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000001000681 площадью 3,4933 га. Составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение: участок 1, участок 2, ворота, ворота. Изолированное помещение с инв. № 200/D-182124 наименование – складское помещение, назначение – складское помещение, площадью 253,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11М/3-2. **Нач. цена:** 167 313,60 руб. **Задаток:** 16 731,36 руб.

**Лот № 9.** Капитальное строение «магазин» с инв. № 200/С, общей площадью 185,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, д. 36, расположенное на земельном участке с кадастровым № 240100000002000413 площадью 11,1176 га. **Нач. цена:** 31 968 руб. **Задаток:** 3 196,80 руб.

**Лот № 10.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 229,8 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 39 744 руб. **Задаток:** 3 974,40 руб.

**Лот № 11.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 300,5 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 58 752 руб. **Задаток:** 5 875,20 руб.

**Лот № 12.** Изолированное помещение, расположенное на 1-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 291,3 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 50 976 руб. **Задаток:** 5 097,60 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица, и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 04.04.2017, 15.07.2017, 28.11.2017, 02.12.2017, 06.01.2018, 18.01.2018.

**Повторный аукцион состоится 12.03.2018 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 21.02.2018 с 8.30 по 07.03.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ по продаже имущества ОАО «НП ОКБ машиностроения»

| | |
|---|---|
| Дата, время, место и форма проведения торгов, предмет торгов, его местонахождение, начальная цена, порядок ознакомления | 26.03.2018 в 11.00 назначены торги в форме аукциона по адресу: г. Витебск, пр. Строителей, 1, ТЦ «Континент», пом. 157, по продаже:<br>Лот № 1 – Токарный станок 16К20 стоимостью 1657,98 рублей с НДС;<br>Лот № 2 – Токарный станок ИЖ 250 ИТВ стоимостью 1725,29 рублей с НДС;<br>Лот № 3 – Шкаф металлический в количестве 50 штук общей стоимостью 642,60 рублей с НДС;<br>Лот № 4 – Стеллаж канцелярский в количестве 30 штук общей стоимостью 784,08 рублей с НДС;<br>Лот № 5 – Станок фрезерный 6Т10 стоимостью 946,91 рублей с НДС;<br>Лот № 6 – Контейнер для металлолома в количестве 15 штук общей стоимостью 932,04 рублей с НДС;<br>Лот № 7 – Пресс гидравлический (гибочный) PYE 25S стоимостью 1397,64 рублей с НДС;<br>Лот № 8 – Станок фрезерный Maho MH-2000, инв. № 1030 стоимостью 12 434,96 рублей с НДС;<br>Лот № 9 – Станок токарно-винторезный SV 18RA, инв. № 806 стоимостью 648,76 рублей с НДС;<br>Лот № 10 - Станок токарно-винторезный SV 18RA, инв. № 807 стоимостью 889,82 рублей с НДС;<br>Лот № 11 – Станок универсально-заточной, 3В642, инв. № 814 стоимостью 579,50 рублей с НДС;<br>Лот № 12 – Станок точильно-шлифовальный 3Б633, инв. № 728 стоимостью 313,12 рублей с НДС;<br>Лот № 13 – Станок для снятия заусениц, инв. № 918 стоимостью 156,08 рублей с НДС;<br>Лот № 14 – Станок универсально-фрезерный GAMBIN, инв. № 810 стоимостью 2978,78 рублей с НДС;<br>Лот № 15 – Станок плоско-шлифовальный 3Д722, инв. № 810 стоимостью 1559,98 рублей с НДС;<br>Лот № 16 – Станок кругло-шлифовальный 3М152, инв. № 829 стоимостью 1909,07 рублей с НДС;<br>Лот № 17 – Станок настольно-сверлильный 2М112, инв. № 572 стоимостью 200,44 рублей с НДС;<br>Лот № 18 – Станок вертикально-сверлильный 2Н135, инв. № 512 стоимостью 741,96 рублей с НДС, находящихся в производственном помещении ОАО «НП ОКБ машиностроения» по адресу: г. Витебск, пр. Фрунзе, 81 (территория завода «Эвистор»), где их можно осмотреть, предварительно связавшись с ликвидатором по тел. 80297118733 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены предмета торгов |
| Сведения о продавце и организаторе торгов, контактные телефоны | ОАО «НП ОКБ машиностроения» пр-т Фрунзе, 81, 210033, г. Витебск, УНП 3000480644,тел./факс: 80212550271. Организатор – ИП Железовский Юрий Александрович, г. Витебск, пр. Строителей, д. 1, (ТЦ «Континент»), офис № 157, тел. +375 29 711-87-33 |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для его зачисления | Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 23.03.2018 включительно на счет ОАО «НП ОКБ машиностроения» № BY05-AKBB30120201807512000000 Филиала № 200 Витебское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», ул. Ленина,10б, код 635, БИК AKBBBY21200, УНП 300048064. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается |
| Место, дата, время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | г. Витебск, пр. Строителей, д. 1, (ТЦ «Континент», офис. № 157.<br>Дата и время начала приема заявлений – 01.03.2018 в 11.00.<br>Дата и время окончания приема заявлений – 23.03.2018 в 17.00.<br>К заявлению прилагаются:<br>1. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка;<br>2. Для резидентов – копия устава, свидетельство о государственной регистрации, доверенность для представителя юридического лица, документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;<br>3. Нерезидентам – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>4. ИП резидент – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник;<br>5. ИП нерезидент – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>6. Представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;<br>7. Представителем иностранного физического лица, ИП – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.<br>При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, ИП, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию |
| Информация о необходимости возмещения участником, выигравшим торги, затрат на организацию и проведение торгов | Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение торгов (на оценку и на публикацию объявления о торгах) |
| Порядок оформления участия в торгах | К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке |
| Порядок оформления результатов торгов | В день проведения торгов участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в двух экземплярах, который утверждается организатором торгов в день их проведения. После предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и участником, выигравшим торги, либо единственным участником конкурса, либо единственным участником аукциона заключается договор купли-продажи в трехдневный срок |
| Срок оплаты приобретенного предмета торгов | 7 календарный дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов |
| Дополнительная информация | В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона |

# ДОБРАЙ НОЧЫ!

## Колькі доўжыцца здаровы сон і як на нас уплывае недасып

**Трэць свайго жыцця мы праводзім у сне, і недаацэньваць яго важнасць не варта. Якім ён павінен быць, каб арганізм паспяваў цалкам аднавіцца, ці карысна спаць днём і што рабіць, каб добра спаць уначы, мы дазналіся ва ўрача-псіхатэрапеўта Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Іны ЦЕЛЕШ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Іна Валер'еўна, навошта нам сон і што адбываецца, калі чалавек яго пазбаўлены?***

— Сон — важная функцыя, якая мае вялікае агульнабіялагічнае значэнне. Падчас сну ў нас замаруджваюцца абменныя працэсы, зніжаецца нервовае напружанне і мышачны тонус, адпаведна, адбываецца перазагрузка арганізма. Важна і тое, што адбываецца з нашым галаўным мозгам. Падчас сну ідзе сінтэз і апрацоўка інфармацыі, назапашанай за дзень, і раздзяленне яе па ячэйках. Калі ўсё паспяхова завершана, то мозг вызваляецца ад пэўнай часткі інфармацыі і гатовы да паступлення новай. Такім чынам адбываецца нервова-мышачная разрадка, зняцце напружання, аднаўленне. У выніку недасыпання, нязвыкла ранняга прабуджэння чалавек пазбаўлены магчымасці перазагрузкі, адпаведна, назапашваецца напружанне, чалавек робіцца раздражнёным, уразлівым да рознага роду стрэсаў, рассеяным, зніжаюцца кагнітыўныя функцыі нашага мозга, такія як памяць і ўвага. Папросту кажучы, мы робімся забыўлівымі і раздражнёнымі. Акрамя таго, што пакутуе нервовая сістэма, дадатковую нагрузку атрымлівае сардэчна-сасудзістая і эндакрынная. Калі чалавек мала спіць, зніжаецца ўзровень цукру ў крыві. Каб папоўніць энергетычны баланс, мы пачынаем больш есці, што можа садзейнічаць атлусценню, развіццю цукровага дыябету.

***— Медыкі раяць спаць у сярэднім 8 гадзін, але ёсць людзі, якія сцвярджаюць, што спяць 4-6 гадзін і ім гэтага цалкам дастаткова...***

— Патрэба ў сне ў кожнага, вядома, індывідуальная. Але любому чалавеку патрэбна ў сярэднім 7-8 гадзін, каб адпачыць і перазагрузіцца, 4-6 гадзін недастаткова. Рана ці позна гэта адаб'ецца на здароўі.

***— Ці можна выспацца ў запас, скажам на выхадных, папоўніўшы штодзённы недасып падчас працоўнага тыдня?***

— Не, гэта немагчыма. Больш за тое, залішні і несвоечасовы сон таксама можа пагоршыць наша самаадчуванне. Можа з'явіцца галаўны боль, стамляльнасць, раздражнёнасць. Зразумела, усе мы імкнёмся папоўніць недахоп сну — прыйшоўшы з працы ці выканаўшы справы, якія рана паднялі з ложка, кладзёмся і спім. Але лепш засынаць своечасова і прачынацца ў адзін і той жа час, такі варыянт больш карысны для здароўя.

***— Чаму дрэнна спаць увечары?***

— Непажадана перарываць цыкл сну, бо гэта ўплывае на яго якасць. Калі паспаць увечары, складаней будзе заснуць уначы або вы будзеце некалькі разоў прачынацца ці канчаткова прачнецеся ў 4-5 гадзін раніцы. І гэта адаб'ецца на вашым стане на наступны дзень — могуць з'явіцца галавакружэнне, санлівасць, млявасць. Некаторым людзям дапамагае зняць напружанне кароткі, да паўгадзіны, дзённы сон у перапынках паміж напружанай разумовай працай, але, калі чалавек дрэнна спіць уначы, не трэба спаць днём.

***— Чаму класціся спаць раяць у 22 гадзіны?***

— Каб выпрацаваўся гармон мелатанін, папярэднік сератаніну. Калі сератанін адказвае за бадзёрасць і добры настрой, яго называюць гармонам шчасця, то мелатанін — асноўны гармон, які рэгулюе сутачныя рытмы, так званы гармон сну, а яшчэ гармон прыгажосці. Таму, калі хочаце заставацца маладымі і прыгожымі, спаць трэба класціся ў 22 гадзіны. Важна, што спаць трэба ў поўнай цемры — без тэлевізара, з зашторанымі вокнамі, каб не свяціліся экраны камп'ютара ці мабільнага тэлефона, электроннага гадзінніка ці будзільніка. Тады лепш выпрацоўваецца мелатанін. Дзецям таксама вельмі важна класціся ў 22 гадзіны — у іх у гэты час выпрацоўваецца самататропны гармон, ці гармон росту.

***— У якім узросце з'яўляюцца парушэнні сну і ад чаго яны залежаць?***

— Парушэнні сну звязаны са станам саматычнага здароўя і наяўнасцю спадарожных захворванняў. Найперш гэта паталогіі сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэмы. Тут усё вельмі індывідуальна, але найчасцей такія хваробы, як парушэнні сардэчных рытмаў, ішэмія, атэрасклератычная хвароба, болі падчас неўрапатыі, цукровы дыябет, бранхіяльная астма, выклікаюць парушэнні сну. Акрамя гэтага, з узростам колькасць тармозячых нейронаў гіпаталамуса зніжаецца і гэта ўплывае на якасць сну: людзі пачынаюць часцей прачынацца, цяжка засынаюць, рана прабуджаюцца.

**«У выніку недасыпання назапашваецца напружанне, чалавек робіцца раздражнёным, уразлівым да рознага роду стрэсаў, рассеяным, зніжаюцца кагнітыўныя функцыі нашага мозга, такія як памяць і ўвага».**

***— Што рабіць, каб хутчэй заснуць?***

— Па-першае, выконваць гігіену сну. Абавязкова класціся спаць у адзін і той жа час, як я казала, з 22 да 23 гадзін. Прачынацца — таксама, прыкладна ў сем раніцы, прымаць кантрасны душ, рабіць лёгкую зарадку. Тады чалавек бадзёры і актыўна пачынае свой дзень. Да сну трэба рыхтавацца: не ўжываць цяжкую ежу на вячэру, садзейнічае лёгкаму засынанню лыжка мёду з цёплай вадой ці шклянка цёплага малака. Перад сном нельга піць алкаголь, каву, псіхастымулюючыя напоі, якія змяшчаюць кафеін, непажадана курыць. Можна звярнуцца да агульных рэлаксацыйных мерапрыемстваў: уявіць прыгожыя пейзажы, успомніць прыемныя рэчы, паслухаць расслабляючую музыку. Не трэба прыносіць у спальню рашэнне нейкіх пытанняў, канфліктных сітуацый, непажадана чытаць штосьці ў інтэрнэце, глядзець фільмы і перадачы, якія ўзрушаюць. Карысныя прагулкі перад сном на свежым паветры. Адэкватная фізічная нагрузка днём таксама станоўча ўплывае на якасць сну ўначы. Калі ўсё гэта не дапамагае, можна звярнуцца ў аптэку па безрэцэптурны прэпараты расліннага паходжання, у склад якіх уваходзіць валяр'ян, пустырнік, баярышнік. Калі і яны не дапамагаюць, ёсць сінтэтычныя прэпараты, якія можна выкарыстоўваць. Калі ж самастойна не ўдаецца справіцца з бяссонніцай, трэба звяртацца да ўрача, лепш да псіхатэрапеўта. Бо бяссонніца разглядаецца ў межах псіхічных расстройстваў.

***— Як вызначыць тую мяжу, калі абавязкова трэба ісці да ўрача?***

— Калі на працягу месяца кожную ноч назіраецца ўстойлівая бяссонніца і не ўдаецца з ёй самастойна справіцца, не даюць эфекту наладжаная гігіена сну і прэпараты, тады трэба звяртацца да спецыяліста.

# ХУТКАЙ ХАДОЙ — АД ІНФАРКТУ

## Каб сэрца не старэла і сасуды не турбавалі

**Хваробы сэрца і інсульт — сёння галоўныя забойцы, якія штогод забіраюць у свеце 17,5 мільёна жыццяў. Паводле пэўных прагнозаў, да 2025 года чакаецца, што амаль трэцяя частка насельніцтва планеты старэй за 25 гадоў будзе пакутаваць ад павышанага ціску, які з'яўляецца адным з самых небяспечных фактараў рызыкі ў развіцці сардэчна-сасудзістых хвароб.**



Але ўрачы ўпэўненыя: нават невялікія змены, унесеныя ў наш лад жыцця, могуць замарудзіць старэнне сэрца. Пра асноўныя з іх расказала **ўрач-тэрапеўт найвышэйшай катэгорыі 2-й раённай паліклінікі г. Мінска Алена ЛАПСАР.**

— Атэрасклероз — гэта назапашванне ў сасудзістай сценцы халестэрыну і іншых рэчываў, якія, утвараючы так званыя атэрасклератычныя бляшкі, звужаюць прасвет сасуда, — тлумачыць Алена Сяргееўна. — Ускладненні атэрасклерозу — інфаркт міякарда і інсульт — з'яўляюцца асноўнымі прычынамі смяротнасці ва ўсім свеце, і наша краіна — не выключэнне. Таму змагацца трэба з фактарамі рызыкі развіцця атэрасклерозу.

### Адмоўцеся ад шкодных звычак

Курэнне паскарае развіццё атэрасклерозу, выклікае спазм каранарных артэрый і ў тры разы павышае рызыку інфаркту міякарда і раптоўнай смерці. Сярод тых, хто кінуў курыць, рызыка ўзнікнення ішэмічнай хваробы сэрца значна зніжаецца і праз пяць гадоў становіцца як і ў тых, хто не курыў ніколі.

Існуе залежнасць паміж ужываннем алкаголю і смяротнасцю ад ішэмічнай хваробы. У тых, хто ўвогуле не п'е і шмат п'е, рызыка вышэйшая, чым у асоб, якія ўжываюць алкаголь умерана. Але такія эфекты алкаголю, як павышэнне артэрыяльнага ціску, змяненне псіхасацыяльнага статусу і іншыя рэакцыі, не дазваляюць рэкамендаваць яго для прафілактыкі ішэмічнай хваробы.

### Прытрымлівайцеся правільнага харчавання

Ежа павінна быць разнастайнай. Яе энергетычная каштоўнасць мусіць быць аптымальнай для папярэджання атлусцення. Ужывайце больш садавіны і агародніны, абмяжуйце колькасць тлушчаў жывёльнага паходжання. Зменшыце ўжыванне солі, калі маеце павышаны ціск.

### Кантралюйце артэрыяльны ціск

Артэрыяльную гіпертэнзію называюць «таямнічым і маўклівым забойцам». Таямнічым — бо ў большасці выпадкаў прычыны развіцця хваробы застаюцца невядомымі, маўклівым — бо ў многіх хвароба праходзіць бессімптомна, людзі не ведаюць пра наяўнасць павышанага ціску, пакуль не разаўецца нейкае ўскладненне. У норме артэрыяльны ціск не павінен перавышаць 140/90 мм рт. сл.

### Кантралюйце ўзровень халестэрыну

У норме ўзровень агульнага халестэрыну павінен быць ніжэй за 5 ммоль/л. Дысліпідэміяй называюць дысбаланс колькасці ў крыві «дрэнных» і «добрых» тлушчавых функцый. Наяўнасць дысліпідэміі ўстанаўлівае ўрач па выніках біяхімічнага аналізу крыві. Яе карэкцыю пачынаюць з дыеты, паколькі высокі ўзровень халестэрыну, як правіла, звязаны з няправільным харчаваннем. Такая дыета складаецца з вялікай колькасці садавіны і агародніны, здаровых гатункаў хлеба, поснага мяса, бабовых, сланечнікавага, кукурузнага ці аліўкавага алею, марской рыбы тлустых гатункаў. Калі з дапамогай дыеты на працягу трох месяцаў не ўдаецца знізіць ліпідны спектр і ў хворага ёсць адначасова іншыя фактары рызыкі, прызначаецца медыкаментозная тэрапія.

### Знізьце лішнюю вагу

Лішняя маса цела, асабліва атлусценне, павышае рызыку развіцця ішэмічнай хваробы сэрца і іншых хвароб, звязаных з атэрасклерозам. Найбольш небяспечнае так званае цэнтральнае атлусценне (мужчынскага тыпу), калі тлушч адкладваецца на жываце. Пра наяўнасць цэнтральнага атлусцення можна меркаваць па акружнасці таліі і суадносінах гэтай велічыні з акружнасцю клубоў. Рызыка сардэчна-сасудзістых хвароб павышаецца ў мужчын з акружнасцю таліі больш за 102 см, а ў жанчын — больш за 88 см. Суадносіны акружнасці таліі з акружнасцю клубоў у мужчын вышэй за 1,0 і ў жанчын вышэй за 0,85 з'яўляюцца дакладным паказчыкам цэнтральнага тыпу атлусцення. Найбольш распаўсюджанымі прычынамі лішняй вагі з'яўляюцца харчовыя звычкі, пераяданне, адсутнасць збалансаванага харчавання, а таксама недастатковая фізічная актыўнасць.

### Павялічце фізічную актыўнасць

У людзей з нізкай фізічнай нагрузкай сардэчна-сасудзістыя хваробы развіваюцца ў два разы часцей, чым у людзей, якія вядуць актыўны лад жыцця. Хадзьба ў хуткім тэмпе на працягу паўгадзіны можа знізіць рызыку інфаркту і інсульту прыблізна на 15 %. Для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых хвароб найбольш падыходзяць рэгулярныя і дастатковыя па часе фізічныя практыкаванні, якія прадугледжваюць рытмічныя скарачэнні вялікіх груп мышцаў: хуткая хадзьба, язда на веласіпедзе, плаванне, хадзьба на лыжах.

### Пазбягайце стрэсу

Уплыў вострага стрэсу на людзей, якія пакутуюць на сардэчна-сасудзістыя захворванні, відавочны. Стрэс прыводзіць да прыступаў стэнакардыі, арытміі і развіцця сардэчнай недастатковасці. Ён таксама можа выклікаць раптоўнае развіццё інсульту і інфаркту міякарда. А станоўчыя эмоцыі — залог паспяховага лячэння.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

Валянцінкаў

# ДЗЕВЯЦЬ МУЖОЎ З ДЗЕСЯЦІ

**«Так...»**
**Маша любіла гэтае слова: яно, кароткае — усяго тры літары, мела дзівосную ўласцівасць — «збіраць» у кучку ўсе яе думкі, адсякаць непатрэбнае, канцэнтравацца на самым важным.**
**Вось зараз, напрыклад, ёй трэба было дагатаваць абед і сабрацца на працу. На ўсё пра ўсё, як той казаў, гадзіна часу. І Маша павінна была, магла паспець: закінуць у мультыварку ўсё для супу, «наляпіць» катлетак, зрабіць лёгкі макіяж, адзецца, абуцца і выбегчы на прыпынак.**
**Сёння, як учора, як летась і пазалетась...**

За час замужжа яна прывыкла штодня (выхадныя не ў залік) падымацца а сёмай раніцы, карміць сям'ю сняданкам ды выпраўляць з хаты, а самой потым брацца за абед — найперш для мужа, бо той, яшчэ ў войску «пасадзіўшы» страўнік, фізічна не пераносіў не тое што нейкіх ссабоек, нават абедаў у сталовай: яму толькі сваё, дамашняе, жончына. З-за чаго, дарэчы, нават працу змяніў: сышоў з больш грашовай, з завода (здароўе даражэй), уладкаваўся ў суседні ЖЭС.

Пасля гэтага (ну што казаць) Машына жыццё ўскладнілася: цяжкавата было (асабліва па першасці) кожны ранак стаяць ля пліты, выдумляць ды гатаваць нешта свежае. Але ж потым уцягнулася, прывыкла, ды што там — ёй нават прыемна было адчуваць сваю незаменнасць. «Ну вось жа, — думала час ад часу, — мужчына, дужы, разумны, не бязрукі, а на кухні — што тое дзіця: без яе зусім прапаў бы!»

Слава, здаралася, ёй гэта казаў: што прыемна — не раз і нават пры сведках...

«Так, — яшчэ раз паўтарыла Маша, — суп варыцца, катлеты ў каструлю і на пару. Самой можна адхінуцца на макіяж». Балазе гэта недалёка: яна папрасіла — і Слава побач з халадзільнікам спецыяльнае люстэрка павесіў, маленькую палічку прыбыў. Таму зараз ёй патрэбы не было некуды адхінацца: адным вокам, што называецца, магла сачыць за «працэсамі» на пліце, другое — фарбаваць.

Тэлефон... Зранку... Што дзіўна было, — гарадскі і зусім недарэчы. Маша кінула на палічку туш, сказала сваё: «Алё».

— Гэта кватэра Кулікоў? — пытаўся ў яе нехта незнаёмы.

— Так.

— Запішыце адрас.

— Які? І навошта? — спытала Маша, паспеўшы ўспомніць, што гэта некалі яе бацькі-вяскоўцы магчы скарыстацца акадзіяй — з некім перадаць «гуманітарку»...

Мужава радня, здаралася, таксама штосьць перадавала з Піцера — з праваднічай цягніка.

Але ж гэта было ў мінулым стагоддзі. Цяпер, калі амаль што, у кожнага ёсць мабільнік, нешта адпраўляючы, ім бы пазванілі, папярэдзілі, сказалі той адрас самі...

— Дык вы запісваеце? — дапытваўся нехта ў Машы. — Вуліца Савецкая, дом...

Голас у слухаўцы гучаў як з бочкі (ці з ужо забытага тэлефона-аўтамата?), ён то прападаў, то зноў «выплываў». Нешта з яго запісваць (а тым больш адрас — прыблізна...) сэнсу не мела. А вось падысці да пліты — яшчэ і як.

Маша паклала слухаўку, паглядзела катлеты, выключыла суп, падфарбавала вочы. Імі, значна прыгажэйшымі, зірнула на тэлефон. Той, на шчасце, маўчаў. «Значыць, не адзін Гаўрыла ў Полацку, а Кулік у Мінску», — не паспела падумаць яна, як апарат азваўся яшчэ раз. І... усё пачалося спачатку:

— Кватэра Кулікоў?

— Кулікоў.

— Пішыце адрас...

— Чый?! — зноўку пытала Маша, павысіўшы голас.

— Вуліца Савецкая... Запісалі?

Трэба сказаць, што на гэты раз сувязь была значна лепшай (Маша, прынамсі, чула ўсё), а вось яе — не... Ці рабілі выгляд, бо жанчына як заведзеная пляскала сваё:

— Савецкая, дом 45... Кватэра... Вы запісалі?

— Я запомніла, але што там?!

— Там, вы гэта павінны ведаць (кожнае слова цяпер гучала адрывіста — як праз паўзу)... Там жыве каханка вашага мужа... Яны разам ужо тры гады...

Словы гэтыя сцебанулі наводмаш і настолькі балюча, што Маша яшчэ раз... кінула трубку.

«Так...» — зноў сказала сабе. Але гэтае слова больш не працавала: думкі разбегліся ва ўсе бакі і ў кучу збірацца нават не думалі. «Значыць, ён як усе... Як іншыя. Анічым не лепшы... Тры гады... Гэта што — ён адсюль, з дому сыходзіў туды? А яна яму свежанькі супчык, паравыя катлеткі... Каб хацця не хварэў...»

Твар яе палаў ад сораму і абразы, сэрца сціскалася ад болю, ёй — здавалася — не было чым дыхаць. «Так, — загадала сабе яшчэ раз, — трэба выключыць газ, узяць пад язык таблетку, расчыніць акно...»

Яно, іх кухоннае, выходзіла ў двор, дзе — міжволі заўважыла — стаяла... машына мужа. Але чаму, калі гадзіну таму ён паехаў на працу? І што — вярнуўся? Бо неяк звязаны з жанчынай, якая толькі што званіла, ці...

Была за ім (Маша ведала) яшчэ адна абсалютна незразумелая звычка — з'яўляцца побач, калі ёй было вельмі дрэнна. Слава жартаваў яшчэ, што адчувае гэта на адлегласці, — як той сабака...

Вось і зараз з калідора данесліся ягоныя хуткія крокі, забразгалі ключы, адчыніліся дзверы. Усё адбывалася настолькі хутка і нечакана, што ні выйсці насустрач, ні хоць нешта сказаць Маша не змагла.

— Што з табой? — спалохана спытаў муж. — Сэрца? З-за чаго?

— Мне толькі што званілі... Нейкая жанчына, — з цяжкасцю гаварыла Маша.

— ...І што сказала? Нехта памёр? — дапытваўся Слава.

— Ты...

— ?!



— Яна сказала, што ў цябе ёсць іншая... Што яна жыве па адрасе: вуліца Савецкая, дом 45, кватэра...

— І ты ёй паверыла?

Кожнае слова цяпер ужо муж прамаўляў праз паўзу.

— А не трэба было?

Слава моўчкі паглядзеў на яе і пайшоў на балкон.

На пліце ўжо «дайшлі» катлеты. Гадзіннік «крычаў», што ёй пара на прыпынак (спазняцца на працу не выпадала ніяк).

Таму, спехам прычасаўшыся і адзеўшыся, яна рушыла да дзвярэй.

— Я цябе падвязу, — падрадзіўся муж.

«Значыць, размаўляць ён мяркуе па дарозе? — здзівілася Маша. — На хаду? Што ж — гэта лепей, чым чакаць да вечара».

На ватных нагах яна выйшла з кватэры, спусцілася са свайго паверха, села ў машыну — яны паехалі. Моўчкі...

Слава добра кіраваў машынай, Маша давярала яму — прычым настолькі, што раней, уладкаваўшыся побач, нешта вязала альбо, сеўшы ззаду, уголас чытала кніжкі — дзецям і яму...

А вось цяпер яна думала — аб тым, што было і што ж будзе. Думала засяроджана і пакутліва — аж пакуль муж не тармазнуў на чарговым святлафоры, прычым неяк рэзка.

— Куды мы едзем? — схамянуўшыся ды зірнуўшы па баках, спытала Маша.

— Як куды? На вуліцу Савецкую, дом 45... — адказаў Слава.

— Чаго?

— Ну цікава ж...

Маша любіла і магла пасмяяцца. Але, здаецца, ніколі яшчэ не смяялася *так*, бо вось гэтае мужава «цікава ж» яна ўжо чула: чула, калі Слава, упершыню прыехаўшы да яе бацькоў, пайшоў з матуляй... даіць карову, потым — з бацькам — запрагаць каня і дагледаць пчол. Да таго ж па дарозе ў вёску альбо адтуль ён мог калі-ніколі спыніцца каля нейкай царквы ці старога млына, каля звычайных вясковых могілак ці хаціны з прыгожымі аканіцамі, бо яму і сапраўды было вельмі цікава — нешта ўбачыць самому, нешта паказаць сям'і.

Вось і зараз, як высвятляецца, ён вёз яе, Машу, зусім не на працу (хоць гэта і крыху па дарозе), а туды, дзе жыве...

Значыць, «не жыве»?! Значыць, усё няпраўда?!

Каму і навошта яна спатрэбілася? Хто хацеў пасварыць іх, можа, нават разбурыць сям'ю, аб гэтым Маша збіралася падумаць заўтра, а сёння...

Сёння яна сказала сваё любімае:

— Так... На Савецкую мы не едзем, бо што там рабіць? Мне, ва ўсякім разе... Але ў нас ёсць дзесяць хвілін часу.

— З мяне кава? Ці марозіва? — спытаў муж, кіруючы ў бок гастранома.

...Ён жа недзе праз гадзіну на яе электронную пошту скінуў ліст, у якім, апроч іншых звычайных і мілых слоў, была... новая версія стварэння свету. Паводле яе, першы мужчына быў не адзін — іх, Адамаў, Бог стварыў ... дзесяць! І ўсё адно яны сумавалі. Тады Бог прыдумаў для іх занятак: прынёс гліны і цукру, сказаў, каб кожны — з гэтай вось «сыравіны» — зляпіў сабе жонку (а ён іх потым «ажывіць»).

Мужчыны загарэліся, яны вельмі стараліся, бо кожны, дабаўляючы слодыч, ляпіў сваю, для сябе, якую хацеў...

Бог, «прымаючы работу», гэта ацаніў. Але ж не мог не заўважыць (прычым уголас), што цукру было адзінаццаць кавалачкаў, а не дзесяць. Значыць, нейкі з мужчын паклаў у свой «выраб» два? Высвятляць, каторы з іх (і ў каторую з жанчын), не было часу і, як быццам, патрэбы? Але пытанне засталося...

І з той самай пары дзевяць мужоў з дзесяці перабіраюць жанчын — шукаюць тую, самую салодкую.

І толькі адзін з іх гэтага не робіць, бо... *з'еўшы* той дадатковы драбочак цукру, дакладна ведае: «найсаладзейшая» з жанчын — свая.

**Валянціна ДОЎНАР.**

---

■ І жартам, і ўсур'ёз

## КОЛЬКІ ЛАП У ПЕЎНЯ?

**Зусім нядаўна ў школе быў вечар сустрэчы з былымі вучнямі, з выпускнікамі розных гадоў. Глядзела я на іх, былых хлопчыкаў ды дзяўчатак, і столькі ўсяго ўспомніла...**

Урок матэматыкі. Тэма «Лік і лічба 2».

— Дзеці, — звяртаюся да класа, — прывядзіце прыклады, дзе пры лічэнні сустракаецца лік два.

— Дзве рукі, дзве нагі, два вухі, дзве лапы ў пеўня, — гучыць наперабой.

Цягнецца ўгору і рука Міхася.

— А ў нашага пеўня чатыры лапы!

— Няпраўда, так не бывае, — абураюцца дзеці.

— А вось і бывае, — настойвае хлопчык.

Каб прымірыць, кажу:

— Міхась, а давай, калі скончацца ўрокі, мы з табой сходзім ды паглядзім на вашага пеўніка.

— Не, вы яго ўжо не ўбачыце. (Міша ніжэй апускае галаў.) Учора яму тата зрабіў «сякір-башка»!

Шкадую птушку, даю дзецям заданне, каб дома палічылі, колькі лап у іх пеўняў. Раптам яшчэ недзе ёсць — на чатырох і жывы?

* * *

Адкрыты ўрок чытання (на ім было шмат настаўнікаў). Тэма — «Гук і літара Ж».

Усё як заўсёды: дзеці чытаюць, адказваюць на пытанні.

— Калі ласка, — прашу, — прывядзіце прыклады, дзе ў словах чуецца «Ж».

— Жолуд, жораў, жаба, «Жыгулі»...

Зноў той жа Міша трасе рукой. Ну як яго не выклікаць?!

— Ж...а, — выдае свой прыклад хлопчык.

Бянтэжыцца не выпадае.

— Правільна, — працягваю ўрок я, — у гэтым слове таксама чуецца гук «Ж».

...Думала, мае калегі потым зробяць заўвагу, што не паспявадала вучня. А яны мяне нават пахвалілі, што не разгубілася.

* * *

Урок чытання. Тэма «Гук і літара Ф».

Дзеці (на ўроку прысутнічаў завуч) за 45 хвілін навучыліся чытаць і выдзяляць «Ф». Званок на перапынак. Завуч, выходзячы з класа, бярэ ўказку, паказвае «пройдзеную» літару на **фі**знай карце, што вісіць на сцяне, пытае:

— Дзеці, дык якая гэта літара?

Тыя ледзь не хорам:

— Фэ! Фэ!..

Завуч:

— А ну стройцеся па два. Я вас зараз завяду і пакажу, дзе «фэ»...

Толькі адна дзяўчынка сказала:

— Гэта «эф», а не «фэ»!

Выручыла, карацей, і настаўніцу, і астатніх дзяцей ад паходу туды, дзе «фэ».

**Сафія Атрохава,**
*в. Селішча, Слуцкі раён*



# 100 гадоў на варце міру





23 лютага Узброеныя Сілы Беларусі адзначаюць 100-гадовы юбілей. Для фотажурналістаў «Звязды» гэтая падзея не засталася незаўважанай, яны часта бываюць у армейскіх падраздзяленнях, удзельнічаюць у вучэннях, назіраюць, як ідзе мадэрнізацыя ваеннай тэхнікі. Да гонару «Звязды», газета хоць і не армейскае выданне, але заўсёды жыва рэагавала на жыццё і дасягненні беларускіх вайскоўцаў на працягу ўсяго стагадовага доблеснага і гераічнага перыяду.

**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і Анатоля КЛЕШЧУКА.**
**Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by**







## ОАО «Гомельоблреклама» извещает о проведении 7 марта 2018 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % после несостоявшихся торгов по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006004802 площадью 0,1849 га** – для эксплуатации и обслуживания административного здания**. Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7 | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-42584**, **общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административный корпус.** Составные части и принадлежности: **галерея.** Забор железобетонный **36,0 п. м** (инв. № 114), озеленение (7 деревьев) (инв. № 13), вертикальные планировки и благоустройство (инв. № 12), в т. ч.: проезжая часть **632,0 кв. м**, борты **42,0 кв. м**; распределительные пункты ПР – 3 шт. (инв. № 37); распредустройство – 3 шт. (инв. № 32) | **66 628,00** | **3 331,40** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. **Организатор торгов**: филиал «Эксперт-Услуга» ОАО «Гомельоблреклама». Конт. тел.: 8 (029) 694-43-89, 8 (0232) 23-23-53 – Грачева Полина Станиславовна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 21 февраля 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 6 марта 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества**. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение о первых торгах опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

## ОАО «Белхудожкерамика» уведомляет о проведении годового общего собрания акционеров 30 марта 2018 года в 14.00 по адресу: г. п. Радошковичи Молодечненского района Минской области, ул. Советская, 12.

**Повестка дня**

1. Отчет директора ОАО «Белхудожкерамика» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2017 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета за 2017 год.
3. Отчет ревизионной комиссии ОАО «Белхудожкерамика».
4. Утверждение бухгалтерского баланса и годовых отчетов общества за 2017 год.
5. Принятие решения о выплате дивидендов за 2017 год.
6. Определение порядка распределения чистой прибыли ОАО «Белхудожкерамика» и выплаты дивидендов на 2018 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества, установление размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

УНП 600077830

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Мозырский НПЗ»

**Лот № 1.** Адрес: г. Минск, ул. Кабушкина, 66, пом. 1.
1. Наименование: Административное помещение с инвентарным номером 500/D-685070, 1948 г. п. Площадь – 590,00 кв. м. Назначение: Административное помещение. Примечания: Помещение расположено на 1-3-м этажах. Сооружения дворовые: забор металлический (38,5 $м^2$) с воротами, инв. № 49339; плитка тротуарная с бордюром, площадь 212,6 $м^2$, инв.№ 49340.
2. Внутренние коммуникации и оборудование: кабель телефонный с абонентской коробкой с инв. № 49331; теплоузел с инв. № 49332; шкаф со встроенным оборудованием с инв. № 49333; электрическая силовая компьютерная сеть с инв. № 49334; электрическая силовая сеть с инв. № 49335; охранно-пожарная сигнализация с инв. № 49336; система кондиционирования воздуха с инв. № 49337; объектовое оконечное устройство передачи извещения с инв. № 49338.

**Начальная цена с учетом НДС 20 %** – 628 719,41 бел. руб. **Задаток** – 62 871,94 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %

**Обременения**: Часть помещения с инв. № 500/D-685070 сдается по договорам аренды: № 09-14/22 от 02.05.2014 (площадь, сдаваемая в аренду, – 89,80 кв. м); № 09-14/04 от 31.01.2014 на срок по 31.01.2021 (площадь, сдаваемая в аренду, – 53,40 кв. м)

**Земельный участок**. Изолированное помещение с инв. № 500/D-685070, расположено в здании с инв. № 500/С-5114, под обслуживание которого выделен земельный участок площадью 0.0555 га с кадастровым номером 500000000002001863. Целевое назначение земельного участка: Эксплуатация и обслуживание части здания. Право постоянного пользования.
Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в санитарно-защитных полосах водоводов: санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 0,0178 га; санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 0,0024 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Аукцион состоится 15.03.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Мозырский НПЗ», проводимом 15 марта 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 13.03.2018 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Нечаев Сергей Викторович, тел. 8 029 656-85-61.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.06.2017 г.

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## 26 марта 2018 г. в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, состоится открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды нежилых помещений, принадлежащих Республиканскому унитарному предприятию почтовой связи «Белпочта» Гомельский филиал на праве хозяйственного ведения

| № лота | Наименование и адрес объекта аренды | Арендуемая площадь, (кв. м) | Ставка арендной платы за 1 кв. м в месяц, бел. руб | Начальная цена продажи права заключения договора аренды (в т. ч. НДС 20 %), бел. руб. | Размер задатка (в т. ч. НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение на 1-м этаже в здании отделения связи с инв. № 350/С-4428, Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Октября, 81 | 48,3 | 12,31 | **183,54** | 18,35 |
| 2 | Помещение на 2-м этаже в здании отделения связи с инв. № 350/С-4428, Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Октября, 81 | 23,5 | 12,31 | **89,30** | 8,93 |
| 3 | Два помещения на 2-м этаже в здании отделения связи с инв. № 350/С-4428, Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Октября, 81 | 29,9 (14,3;15,6) | 12,31 | **113,62** | 11,36 |
| 4 | Помещение на 2-м этаже в здании отделения связи с инв. № 350/С-4428, Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Октября, 81 | 9,0 | 12,31 | **34,20** | 3,42 |
| 5 | Помещение на 3-м этаже в здании Речицкого РУПС с инв. № 340/С-28644, Гомельская обл., г. Речица, ул. Советская, 66 | 20,7 | 9,12 | **78,66** | 7,87 |
| 6 | Помещение на 2-м этаже в здании участка обработки почтовых переводов с инв. № 320/С-19744, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Урицкого, 41 | 27,0 | 11,40 | **102,60** | 10,26 |
| 7 | Три помещения на 1-м этаже в здании участка обработки почтовых переводов с инв. № 320/С-19744, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Урицкого, 41 | 37,7 (6,9; 19,1; 11,7) | 11,40 | **143,26** | 14,33 |
| 8 | Помещение на 2-м этаже в здании Речицкого РУПС с инв. № 340/С-28644, Гомельская обл., г. Речица, ул. Советская, 66 | 27,4 | 9,12 | **104,12** | 10,41 |

Коэффициент к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества, составляет 3,0

**Срок договора аренды:** 5 (пять) лет, начиная с момента заключения договора аренды. **Цель использования объектов аренды:** для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). **Шаг аукциона**: 10 %. Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с арендодателя № **BY35AKBB30120210200543100000 в филиале №302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, BIC: AKBBBY21302. Получатель платежа – РУП «Белпочта» Гомельский филиал. УНП 400395996. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту №___ согласно извещению в газете «Звязда» от 21 февраля 2018 г. Участник аукциона, желающий участвовать в торгах в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого лота.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю аукциона), будет засчитан в счет окончательной стоимости права заключения договора аренды, сформированной в установленном порядке. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 22 марта 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор выдает билет участника аукциона, в котором указан порядковый номер регистрации данного лица.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, в т. ч. индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **26 марта 2018 г**. Договор аренды может быть заключен только с участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.
Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238».
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе, лицом, приравненным к победителю аукциона, признается единственный зарегистрированный участник аукциона, согласившийся купить предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не имеет права отчуждать право аренды объекта третьим лицам, а также сдавать объект в субаренду.
